СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 4.31, 21.44, 17.08;
Віцебск — 4.18, 21.42, 17.24;
Магілёў — 4.26, 21.33, 17.04;
Гомель — 4.32, 21.21, 16.49;
Гродна — 4.53, 21.58, 17.05;
Брэст — 5.03, 21.48, 16.45.

МЕСЯЦ:
Поўня 15 чэрвеня.

ІМЯНІНЫ:
Дарафея, Канстанціна, Фёдара, Аляксандра, Леаніда, Георгія; Марка, Эльжбеты.

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

18 ЧЭРВЕНЯ 1992 г.
чацвер, № 121 (21899)

ВОЗГЛАС

НАКІРАВАННЕ НА САМАКІРАВАННЕ

У пачатку чэрвеня ў Мінску прайшла рэспубліканская канферэнцыя народных дэпутатаў мясцовых Саветаў Рэспублікі Беларусь і прадстаўнікоў розных рухаў і партый, прысвечаная праблемам мясцовага самакіравання ў РБ.

Яны адзначылі, што змены ў грамадска-палітычным ладзе патрабуюць глыбокіх прававых і структурных пераўтварэнняў сістэмы мясцовага самакіравання. Прамоўцы таксама адназначна канстатавалі, што цяперашні Вярхоўны Савет РБ не ажыццявіў рашучых крокаў па стварэнню прававой базы ўсталявання дэмакратычных інстытутаў улады ў пераходны да рынку перыяд. А метады кіравання грамадствам і эканомікай засталіся ранейшымі — камандна-адміністрацыйнымі. Удзельнікі канферэнцыі, ўсебакова разгледзеўшы пытанні дзейнасці мясцовых Саветаў, прапануюць Канстытуцыйнай камісіі ВС РБ унесці ў праект Канстытуцыі Беларусі ў раздзел «Мясцовае самакіраванне» некаторыя папраўкі: дэцэнтралізацыя дзяржаўнай улады, размежаванне дзяржаўных і мясцовых улад, прадстаўнічых і выканаўчых органаў; поўная самастойнасць мясцовых Саветаў у вызначэнні ўнутранай будовы і структуры кіруючых органаў і іншыя.

СУСТРЭЧЫ С. ШУШКЕВІЧА НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ

ГРОДНА (**Б. Пракопчык**). Шмат праблем узнялі работнікі адукацыі і культуры Гродзеншчыны ў сваіх выступленнях на сустрэчы са Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. Шушкевічам, якая адбылася ўчора ў абласным цэнтры. Вось толькі некаторыя з іх. Значна скараціліся аб'ёмы будаўніцтва і капітальнага рамонту школ, дашкольных устаноў, амаль не будуецца жыллё для настаўнікаў. Многія школы так перагружаны, што вымушаны працаваць у тры змены. Трывожная сітуацыя з забеспячэннем іх мэбляў, абсталяваннем. Пачасціліся выпадкі, калі сістэма грамадскага харчавання адмаўляецца трымаць на сваім балансе школьныя сталовыя, што пагражае рэзкім пагаршэннем харчавання і здароўя дзяцей. Заклапочаныя ўласнымі праблемамі, забыліся на школы і некаторыя базавыя прадпрыемствы.

Што датычыцца культуры, то прыводзіліся такія факты: у вёсцы ўжо спынілі сваё існаванне 75 клубаў, 51 бібліятэка, 43 кінаўстаноўкі і 4 музычныя школы.

Шмат гаварылася на сустрэчы і аб праблемах, звязаных з выкананнем Закона аб мовах. Як выкладаць на беларускай мове, калі ў школах катастрафічна не хапае вучэбнай літаратуры. Выкладанне гісторыі Беларусі выдзелена ў самастойны прадмет, але падручнікаў для 9—11 класаў таксама няма. Сёлета вывучэнне гэтага прадмета пачнецца ўжо з 5 класа. Але зноў жа — дзе знайсці падтрымку? Не меншая праблема з падрыхтоўкай выкладчыкаў, якія добра ведалі б беларускую мову. Напрыклад, калі ў Гродзенскім універсітэце выкладчыкі будуць сённяшнімі тэмпамі перакладваць свае курсы на беларускую мову, то на вырашэнне гэтых задач спатрэбіцца амаль 50 гадоў.

Міністр адукацыі рэспублікі В. Гайсёнак паведаміў прысутным, што вядзецца распрацоўка шэрагу нарматыўных актаў, накіраваных на вырашэнне праблем, што хвалююць навучальныя ўстановы. У прыватнасці, распрацоўваецца пытанне прывядзення ў адпаведнасць з існуючым заканадаўствам зарплаты выкладчыкаў. Хутка будзе падпісаны загад, накіраваны на паскарэнне беларусізацыі вышэйшых навучальных устаноў.

Адказаўшы на шматлікія пытанні ўдзельнікаў сустрэчы, С. Шушкевіч падкрэсліў, што вельмі важна захаваць тыя найважнейшыя дасягненні ў галіне адукацыі, якія ў нас ёсць. Разам з тым нам трэба будаваць моцную эканоміку, без якой не змогуць нармальна існаваць ні адукацыя, ні культура.

Пасля гэтай сустрэчы С. Шушкевіч пазнаёміўся з некаторымі фермерскімі гаспадаркамі і пабываў у адной з калектыўных гаспадарак Гродзенскага раёна.



Што будуе Анатоль ЗАГОРСКІ? Мае намер пашырыць хлеў. Справа, здаецца, не вялікага маштабу, але за ёю бачацца буйныя змены ў жыцці працаўнікоў калгаса «Зара» Валожынскага раёна.
Многія вяскоўцы цяпер трымаюць свіней, адкормліваюць цялят, даглядаюць птушку. Жыццё прымушае. А калгас спрыяе.
Вось таму механізатар Анатоль Загорскі ўзяўся за прыбудову. Як у любой справе побач з ім яго дочкі — першыя памочніцы. **Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

ЗАКАЎКАЗЗЕ: ВАЕННЫХ ІНТАРЭСАЎ БЕЛАРУСЬ ТАМ МЕЦЬ НЕ ПАВІННА

Амаль два тыдні знаходзіліся ў Азербайджане дэпутаты беларускага парламента Віктар Кучынскі і Сяргей Навумчык. Яны паехалі туды ў якасці назіральнікаў — сачыць за ходам прэзідэнцкіх выбараў.

Як вядома, перамогу на выбарах атрымаў старшыня Народнага фронта Азербайджана Эльчыбей, адзначыў С. Навумчык. Гэта было відавочна яшчэ перад пачаткам галасавання, а таму беларускія дэпутаты вырашылі заняцца іншымі пытаннямі: разглядам перспектыў узаемавыгаднага эканамічнага супрацоўніцтва, культурных сувязей і г. д. Стала вядома, напрыклад, што ў самы бліжэйшы час паміж нашымі дзвюма краінамі будуць устаноўлены дыпламатычныя адносіны. Што ж датычыцца ўнутрыпалітычнай абстаноўкі ў Азербайджане, то, па назіранню С. Навумчыка, гэтая краіна становіцца на шлях дэмакратычных перамен. Між тым, многія сродкі масавай інфармацыі, найперш расійскія, працягваюць палохаць нас узрастаючай пагрозай ісламскага фундаменталізму. Гэта далёка не так. А наогул на ўсе падзеі, якія адбываюцца тут, трэба глядзець праз прызму праблемы Нагорнага Карабаха, улічваючы, што рэспубліка фактычна знаходзіцца ў стане вайны. Па дарозе ў атэль аўтамабіль, у якім ехалі дэпутаты, разоў пяць спынялі ўзброеныя аўтаматамі паставыя, а ў адным месцы, даведаўшыся, што Віктар Кучынскі — былы артылерыст, не саромеючыся, прапанавалі яму... «заняцца практыкай».

Ваеннае пытанне тут самае складанае, адзначылі дэпутаты. А Беларусь у гэтым рэгіёне не мае і мець не павінна ніякіх іншых інтарэсаў, акрамя эканамічных і культурных. «Мы адчулі гэта асабліва востра пасля наведвання Нахічэвані,—сказаў В. Кучынскі. — У адной з дывізій, якая тут знаходзіцца, нясуць службу 38 афіцэраў-беларусаў — ад лейтэнанта да генерал-маёра. Мы прывезлі іх заяву да Вярхоўнага Савета Беларусі з просьбай перавесці іх на радзіму». Дывізія падпарадкоўваецца камандаванню СНД, а фактычна выконваюцца ўсе загады расійскага міністэрства абароны. «Дык чаму ж мы павінны рызыкаваць жыццямі дзеля чужых інтарэсаў, што рабіць тут беларусам?» — задаюць пытанне афіцэры. На жаль, адказу няма.

Як вядома, летась беларускім парламентам прынята рашэнне аб вяртанні на радзіму салдат-беларусаў. Але якая розніца, чыё жыццё выратоўваць— салдацкае ці афіцэрскае? Генерал-маёр Расціслаў Слабашэвіч на сваю просьбу аб пераводзе атрымаў звычайную стандартную адпіску, зробленую на ксераксе. Нават сваё імя ён вымушаны быў дапісаць сам, каб паказаць жонцы, бо сорам на было за таго чыноўніка з Міністэрства абароны Беларусі, які прыслаў гэтую цыдульку. Здавалася б, самы дробязны факт, але ён пра многае гаворыць. Слабашэвіч жа выдатны спецыяліст. Гейдар Аліеў, кіраўнік парламента Нахічэвані, прапанаваў яму пасаду міністра абароны рэспублікі. Вось як там цэняцца нашы людзі.

Паралельна з беларускімі парламентарыямі тут знаходзілася і дэлегацыя з Украіны. Яна прыляцела на двух самалётах: салдат-украінцаў загружалі адразу, выязджалі таксама і афіцэрскія сем'і. Самі ж афіцэры-украінцы, згодна з рашэннем парламента, будуць вывезены з зоны канфлікту ўжо ў ліпені. Вось дзе дзяржаўны падыход да праблемы. Нам жа, як заўсёды, прыйдзецца, відаць, потым шукаць вінаватых.

Вядома, у справе вяртання ваеннаслужачых на радзіму патрэбен комплексны падыход. Ёсць ужо звыш 7 тысяч заяў. Тыя, хто служыць, скажам, у Смаленску, могуць пачакаць, а з «гарачымі» кропкамі трэба разбірацца тэрмінова. Неабходна найперш выпрацаваць сам механізм вяртання. Гэта павінна быць або рашэнне Вярхоўнага Савета, або пастанова Прэзідыума з адпаведнымі ўказаннямі МА і канкрэтна міністру. Адкладваць справу нельга— людзі ходзяць пад кулямі кожны дзень. Узаемаадносіны з іншымі краінамі Садружнасці па гэтаму пытанню можна адладзіць ужо на бліжэйшай сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

ГРАДЫЁЗФАКТ

Больш за тысячу заяў ад жыхароў Крыма з просьбай аб прадастаўленні расійскага грамадзянства зарэгістравана ўжо ў Вярхоўным Савеце Расіі. Апрача таго, у Сімферопалі сабрана каля 50-ці тысяч аналагічных заяў для адпраўкі ў Маскву, паведаміў карэспандэнту РІА дэпутат Вярхоўнага Савета Крыма Барыс Кізілаў. Канстытуцыя Крыма, што дзейнічае крыху больш як месяц, дапускае двайное грамадзянства, і крымчане маюць права звярнуцца з просьбай у любую дзяржаву.

●

І на сесію не ходзяць, і ініцыятывы ўлад правальваюць народныя дэпутаты Пінска. Вось такая абстаноўка склалася зараз у Пінскім гарсавеце. Не адбылася, дарэчы, і апошняя, нечарговая 16-я сесія—у сувязі з няяўкай дэпутатаў. А 15 з іх наогул заявілі, што больш на сесію хадзіць не будуць. Прычыны не ў летнім адпачынку дэпутатаў. Яны больш складаныя. Народных выбраннікаў не задавальняюць тыя пытанні, якія выносяцца на разгляд сесіі. Гэта, у прыватнасці, стварэнне фонду падтрымкі прадпрымальніцтву і прадастаўленне выканкому права выступаць заснавальнікам камерцыйных структур. Стэрэатып мыслення настолькі завалодаў дэпутатамі, што яны ніяк не разумеюць, як можна сёння падтрымліваць «малы» бізнес?

●

Колькасць эмігрантаў з Расіі зменшылася са 104 тысяч чалавек у 1990 годзе да 94-х у 1991 годзе. Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі намеснік міністра працы Расійскай Федэрацыі Ігар Халівінскі. Гэта тлумачыцца тым, сказаў ён, што паступова насычаецца рынак працы ў краінах, якія традыцыйна прымалі эмігрантаў, а таксама тым, што самі эмігранты, аказаўшыся непадрыхтаванымі да новых умоў жыцця, імкнуцца вярнуцца дамоў.

●

На тэрыторыі Эстоніі знаходзіцца каля дваццаці ваенных аб'ектаў, якія Расія не ў стане ахоўваць з-за адсутнасці асабовага саставу, заявіў у эстонскім парламенце намеснік міністра абароны рэспублікі Томас Пуура. Паводле яго слоў, там ідзе раскраданне і знішчэнне маёмасці, якая належыць Эстонскай Рэспубліцы. Пуура адзначыў таксама, што армейскае камандаванне здае ваенныя аб'екты ў арэнду кааператывам, акцыянерным таварыствам, фірмам без узгаднення з эстонскім бокам.

●

Вызваліць памяшканне—такі загад атрымала кіраўніцтва кішынёўскай сярэдняй рускай школы гарадскога ўпраўлення адукацыі. Гэтай навучальнай установе прапануецца памяняцца будынкам з малдаўскай школай на той падставе, што апошняя стала цесна ў сваім.

Сапраўды, у нас умовы лепшыя, — сказала карэспандэнту РІА намеснік дырэктара рускай школы Валянціна Лебедзева.— Але ў нас і ў малдаўскай школе практычна аднолькавая колькасць вучняў, і паляпшаць умовы для малдаўскіх дзяцей за кошт пагаршэння іх для рускіх—несправядліва. Мы расцэньваем такую сітуацыю як дыскрымінацыю па нацыянальнай прыкмеце, — зазначыла Лебедзева.

●

Праваахоўныя органы Расіі спадзяюцца, што ім дазволяць выкарыстаць у аператыўна-вышукной дзейнасці паліграф («дэтэктар хлусні»), і разлічваюць павялічыць з яго дапамогай колькасць раскрываемых злачынстваў. Пра гэта заявіў на брыфінгу ў Маскве намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай Федэрацыі Леанід Уцюрын.

Пастанова Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па працы сацыяльнай абароне насельніцтва

Аб «спажывецкіх карзінах» і мінімальных спажывецкіх бюджэтах для розных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва

У мэтах выканання пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29 мая 1992 года № 323 Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва **пастанаўляе:**

Зацвердзіць:

«спажывецкія карзіны» для розных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва зыходзячы з умоў і асаблівасцей, якія склаліся ў рэспубліцы, згодна з дадаткам 1-XI;

сярэднедушавыя мінімальныя спажывецкія бюджэты па стану на 1 красавіка 1992 года ў разліку на месяц у наступных размерах для:

сям'і з чатырох чалавек	— 1.237 руб.,
мужчыны працаздольнага ўзросту	— 1.400 руб.,
жанчыны працаздольнага ўзросту	— 1.378 руб.,
маладой сям'і з двума дзецьмі	— 1.171 руб.,
маладой сям'і з адным дзіцем	— 1.275 руб.,
сям'і пенсіянераў	— 996 руб.,
мужчыны пенсіянера	—1.104 руб.,
жанчыны пенсіянеркі	— 1.103 руб.,
студэнта	— 1.115 руб.,
студэнткі	— 1.079 руб.,
дзяўчынкі ва ўзросце да трох гадоў	— 902 руб.,
хлопчыка ва ўзросце да трох гадоў	— 890 руб.,
дзяўчынкі ва ўзросце ад трох да шасці гадоў	— 1.097 руб.,
хлопчыка ва ўзросце ад трох да шасці гадоў	— 1.077 руб.,
дзяўчынкі ва ўзросце ад шасці да чатырнаццаці гадоў	— 1.283 руб.,
хлопчыка ва ўзросце ад шасці да чатырнаццаці гадоў	— 1.231 руб.,
дзяўчыны ад чатырнаццаці да васемнаццаці гадоў	— 1.509 руб.,
юнака ад чатырнаццаці да васемнаццаці гадоў	— 1.656 руб.

Намеснік старшыні камітэта А. КОЗЕЛ.
11 чэрвеня 1992 г.
г. Мінск.

***

Зацверджаныя «спажывецкія карзіны» для розных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва распрацаваны Дзяржкампрацай сумесна з Дзяржэканомпланам і Дзяржкамстатам пры ўдзеле Федэрацыі прафсаюзаў і Таварыства спажыўцоў у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб фарміраванні і выкарыстанні мінімальнага спажывецкага бюджэту» і з'яўляюцца наборамі харчовых і нехарчовых тавараў і паслуг, неабходных для задавальнення асноўных фізіялагічных і сацыяльна-культурных патрэбнасцей чалавека. Пры іх распрацоўцы ўлічаны існуючыя ў рэспубліцы асаблівасці ў спажыванні асобных груп прадуктаў харчавання, а таксама рэальныя магчымасці па забеспячэнню жыхароў неабходнымі таварамі і паслугамі.

Найбольш важнай часткай мінімальных спажывецкіх бюджэтаў з'яўляецца «харчовая карзіна», пры фарміраванні якой зроблены разлік хімічнага саставу і энергетычнай каштоўнасці прадуктаў харчавання для розных кантынгентаў насельніцтва на аснове фізіялагічных патрэбнасцей у харчовых рэчывах і энергіі. Набор прадуктаў харчавання працаздольнага насельніцтва вызначаны з неабходнасці забеспячэння пажыўнымі рэчывамі работнікаў сярэдняй цяжкасці працы і фізічнай актыўнасці. Так, для мужчыны працаздольнага ўзросту (30—59 гадоў) папаўненне энергетычных затрат забяспечваецца з разліку 3.050 ккал/суткі, маладога мужчыны (18—29 гадоў) — 3.300, жанчыны працаздольнага ўзросту (30—54 гады)— 2.525, студэнта — 2.450. Мяркуецца, што для задавальнення асноўных патрэбнасцей у харчаванні для працаздольнага мужчыны яго гадавое спажыванне павінна складаць: мяса і мясапрадукты — 63 кг, хлеб і хлебапрадукты — 125, бульба — 180, фрукты свежыя — 37, малако цэльнае — 120, масла — 6, алей, маргарын, тлушчы — 14, цукар — 25. Трэба падкрэсліць, што «спажывецкія карзіны» для дзяцей распрацаваны зыходзячы з крытэрыя прыярытэтнасці іх развіцця, неабходнасці забеспячэння паўнацэннага харчавання. Напрыклад, для дзяцей узроставай групы 6—13 гадоў у рацыён харчавання ўключана штогадовае спажыванне свежых фруктаў — 118,6 кг. Больш чым на 3 кг у параўнанні з дарослым насельніцтвам для іх павялічана норма спажывання масла. У выніку такога падыходу да фарміравання набору прадуктаў харчавання для дзяцей спажывецкія бюджэты падлеткаў 14—17 гадоў значна перавышаюць бюджэты дарослага насельніцтва.

Расходы на нехарчовыя тавары і паслугі вызначаны з улікам узнікшых суадносін паміж размерамі затрат на харчаванне і даходамі насельніцтва. Дэталізацыя і канкрэтызацыя набору нехарчовых тавараў і паслуг праведзена зыходзячы з крытэрыя задавальнення мінімальных патрэбнасцей. Ва ўзбуйненым выглядзе структура «спажывецкіх карзін» і мінімальных спажывецкіх бюджэтаў выглядае наступным чынам:

Сацыяльна-дэмаграфічныя групы насельніцтва	Харчаванне	Адзенне, бялізна, абутак	Прадметы культурна-бытавога і гаспадарчага прызначэння, мэбля	Прадметы санітарыі, гігіены, лякарствы	аплата жылля і камунальныя паслугі	бытавыя паслугі, транспарт, сувязь
	Артыкулы расходаў і іх удзельная вага ў агульных спажывецкіх расходах (у працэнтах)					
Сям'я з чатырох чалавек	59,2	23,9	9,9	1,6	1,7	1,9
Мужчына працаздольнага ўзросту	49,2	23,9	15,7	2,4	3,1	2,3
Жанчына працаздольнага ўзросту	43,0	28,0	16,9	1,8	3,4	3,4
Маладая сям'я з адным дзіцем	51,0	30,0	10,8	1,8	1,9	2,0
Маладая сям'я з двума дзецьмі	51,5	29,9	11,2	1,7	1,8	2,0
Сям'я пенсіянераў	51,1	26,6	14.0	2,4	2,3	1,9
Мужчына пенсіянер	49,3	20,6	19,3	2,8	3,6	2,4
Жанчына пенсіянерка	42,9	27,4	19,9	1,9	3,5	2,4
Студэнт	52,2	37,4	4,4	3,1	0,5	2,1
Студэнтка	48,2	41,2	4,8	2,2	0,6	2,7
Дзяўчынка ва ўзросце да 3-х гадоў	51,1	27,9	13,6	2,2	2,3	2,6
Хлопчык ва ўзросце да 3-х гадоў	51,8	26,9	13,8	2,2	2,3	2,7
Дзяўчынка ва ўзросце 3—5 гадоў	52,3	28,6	11,2	1,8	1,9	2,2
Хлопчык ва ўзросце 3—5 гадоў	53,4	27,3	11,4	1,8	1,9	2,2
Дзяўчынка ва ўзросце 6—13 гадоў	63,6	21,6	9,6	1,5	1,6	1,9
Хлопчык ва ўзросце 6—13 гадоў	67,6	17,0	10,0	1,6	1,7	1,9
Дзяўчына ва ўзросце 14—17 гадоў	59,2	28,2	8,1	1,3	1,4	1,6
Юнак ва ўзросце 14—17 гадоў	59,1	29,5	7,4	1,2	1,3	1,4

Гэтыя спажывецкія бюджэты разлічаны ў цэнах, якія фактычна склаліся ў сакавіку г. г. і з улікам цэн усіх відаў гандлю (дзяржаўнага, спажывецкай кааперацыі, камерцыйнага, калгаснага рынку і інш.).

Велічыня мінімальных спажывецкіх бюджэтаў не з'яўляецца дзяржаўнай гарантыяй і выкарыстоўваецца органамі дзяржаўнага кіравання, прадпрыемствамі і арганізацыямі, грамадскімі арганізацыямі пры прагназіраванні змянення ўзроўню жыцця насельніцтва, узмацнення сацыяльнай абароны і падтрымкі найменш абароненых слаёў насельніцтва. Іх размеры будуць улічвацца пры вызначэнні мінімальнай заработнай платы, пенсій, дапамог, стыпендый, выпрацоўцы сацыяльных праграм дапамогі насельніцтву, фарміраванні сістэмы народнагаспадарчых прапорцый і прыярытэтаў.

Упраўленне сацыяльнай абароны і ўзроўню жыцця Дзяржкампрацы Рэспублікі Беларусь.

У ЭКСТРЭМАЛЬНЫХ АБСТАВІНАХ ЧАЛАВЕК ДЗЕЙНІЧАЕ ПА СТЭРЭАТЫПУ

Рэспубліка косіць траву...

З бабуляй, у якой мы бяром малако, у мяне адна тэма гутарак: надвор'е. У канцы мая — пачатку чэрвеня мы з ёй загаджаліся — патрэбен дождж. Зараз бабуля ўздыхае: дождж ён, канешне, дождж, але... Карацей кажучы, як траву касіць — залівае. Такая традыцыя. Што цікава: колькі б ні ліло— без кармоў не заставаліся, а таксама без мяса і малака.

Сёлета да надвор'я дадаюцца многія іншыя фактары, шырока вядомы, абтаптаныя і ператраўленыя. Але нагадаю: фінансавы крах калгасаў (саўгасаў амаль не засталося), разрыў сувязей, агульная бартэрызацыя, дарагое паліва і яго недахват, рост цэн і г. д. Прасцей кажучы, эканамічны крызіс, які выкошвае перш за ўсё слабых. А калгасы ў нас з моманту арганізацыі такімі і былі. Усё гэта спыняе трактар перад выспеўшай травой.

У лічбах гэта выглядае так. Па рэспубліцы траў скошана на 14 працэнтаў менш, чым летась, у Гомельскай вобласці— ажно на 29. Прычым лічбы старыя. Небывалая рэч: ставіцца задача нарыхтаваць за сезон па 15 цэнтнераў кармавых адзінак на ўмоўную галаву жывёлы. Нагадаю, у мінулыя гады менш 20-ці не было. Колькі ўжо нарыхтоўвалі — справа іншая, але загад быў не менш як дваццаць.

Трактар калгасніка Івана спыняецца і таму, што ў бухгалтэрыі няма грошай. А калі і ёсць на рахунку, то не дае банк па прычыне адсутнасці наяўных. Паспрабуй не дай на заводзе, адразу стыхійны мітынг з перакрыццём вуліц. Калгаснік Іван можа бунтаваць колькі хоча: у цішыні сельскіх ландшафтаў яго пачуе толькі лічбы, а так— адзін да аднаго, амаль поўная ідэнтычнасць.

Не, тут, канешне, не да іроніі, калі гаворка ідзе аб страўніку. Калі Савет Міністраў просіць Нацыянальны банк «...знайсці ў чэрвені—ліпені 1992 г. магчымасць бесперашкоднага выдзялення крэдытных рэсурсаў Белаграпрамбанку для мэтавага крэдытавання мерапрыемстваў, звязаных з нарыхтоўкай кармоў...», то тут міжволі ахопіць глыбокая задуменнасць.

Зноў прыходзіцца паўтараць: трэба зыходзіць з рэальнасці. Так, фермерства і іншая незалежная дзейнасць грамадзян развіваюцца з перамен ным поспехам. Ёсць упартае супрацоўленне і зверху, і знізу — сітуацыя патавая. Іншае пытанне— хто і чаму вінаваты? Больш надзённае — што рабіць зараз? Як ні круці, а выйсце бачыцца ў ранейшых метадах: пастанова Саўміна, яго ж прасякнуты казённым болем «Зварот да насельніцтва рэспублікі», а там адны заклікі, заклікі, заклікі. Яны мала каго краналі раней, а сёння — тым больш. Усё будзе залежаць ад таго, калі, колькі і чаго будзе дадзена вёсцы. Колькі дадуць, столькі і атрымаюць. Такім чынам, усё проста. Палітыка тыпу «дзень пражыць, а там хоць трава не расці».

Зараз яна ў прынцыпе апраўданая і заканамерная: у экстрэмальных абставінах чалавек дзейнічае па стэрэатыпу. А што далей? Што будзе з уборкай збожжа, бульбы, нарэшце, тым жа другім укосам? Што будзе ў наступным годзе? Зноў пастановы і просьбы «знайсці магчымасці»?

Пакуль жа ідуць тынковачныя работы на даволі абадраным фасадзе.

Сяргей ШАЎЦОЎ.

НОВЫЯ ЦЭНЫ НА ЭНЕРГАНОСЬБІТЫ

Дэпартамент цэн Дзяржэканомплана Беларусі інфармуе, што ў адпаведнасці з міжурадавым пагадненнем паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб пастаўцы ў нашу рэспубліку нафты па дзяржаўных рэгулюемых цэнах у размеры 1.800—2.200 рублёў за тону і прыроднага газу па 1.100—1.600 рублёў за 1 тыс. куб. метраў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прыняў пастанову ад 17 чэрвеня 1992 г. № 370 аб увядзенні новых рознічных цэн на нафтапрадукты і газ. У прыватнасці, цэны на аўтамабільны бензін наступных марак і на газ складаюць (за літр):

	У руб. і кап.
А1-93	7-00
А-76	6-00
А1-91	7-00
А-96	8-00
А-92	7-00
Паліва дызельнае	5-60
Газ звадкаваны для запраўкі транспартных сродкаў індывідуальнага карыстання	3-00

(БЕЛТА).

У ВЯЗАЛЬШЧЫЦ БАБРУЙСКАЙ ТРЫКАТАЖНАЙ — НАВАСЕЛЛЕ

Спартыўныя касцюмы Бабруйскай трыкатажнай фабрыкі добра вядомы не толькі беларускім пакупнікам. Гэта прыгожыя, зручныя вырабы з натуральных і штучных тканін для жанчын, мужчын і дзяцей.

Прадпрыемства не стаіць на месцы, ідзе будаўніцтва новага цэха. На два паверхі яго ўжо перасяліліся вязальшчыцы, зараз вядзецца мантаж вязальнага абсталявання і на трэцім.

Добра будзе працаваць у новых памяшканнях трыкатажнікам — гэта светлыя і вялікія цэхі, на кожным паверсе па 750 квадратных метраў. Прадугледжваецца ўкараненне вентыляцыі з увільгатненнем, што палепшыць умовы працы жанчын.

Пасля заканчэння мантажу абсталявання, якое, дарэчы, усё імпартнае, фабрыка будзе выпускаць т. зв. таварнае палатно, якое зараз прывозіць для шыцця касцюмаў з Жодзіна. Вядзецца таксама распрацоўка новых палоцен, якія будуць выпускаць вязальшчыцы на новых машынах.

Васіль ФЯДОСЕНКА.

НА ЗДЫМКАХ: вязальшчыцы Анжэла ТРАФІМАВА і Таццяна КРЫЧКО.

Сям'я: тэра інкогніта, ці Як пераадолець крызіс

БУДУЧЫ Ў АЎСТРАЛІІ, я звярнуў увагу на дарожны знак каля школы: бацька вядзе за руку дачушку. Колькі ні прыгадваў, але ў нас такога не ўспомніў. Сустракаў дарожныя знакі з іншым сэнсам: маці вядзе ў школу сына...

Здавалася б, дробязь, нявартая ўвагі. Але ж каб яна адна? Чаму на прадпрыемствах, у пасёлках толькі саветы мацярок? Чаму пасля Афгана ўзніклі камітэты салдацкіх маці? Менавіта маці, а не бацькоў? Што, у салдат няма бацькоў? Ці ім зусім не цікава, што адбываецца з іх сынамі?

Не, гэта не дробязі. За імі мне бачацца розныя адносіны, нават дзве канцэпцыі поглядаў на ролю жанчыны і бацькі ў сям'і і грамадстве. Аўстралійскія дзеці з маленства засвойваюць ісціну: бацька — галоўны ў сям'і і ён павінен клапаціцца пра сям'ю, але найперш пра «слабы» пол — жонку, маці, дачку.

Наш жа айчынны дарожны знак, відаць, закліканы сведчыць, якіх вышынь дасягнула ў краіне былога сацыялізму эмансіпацыя. Паглядзіце, якая ўвішная савецкая жанчына: яна паспела раней устаць, сабраць і яшчэ да работы на вытворчасці адвесці сынючка ў школу.

Не ведаю як каму, а мне ў дарожных знаках каля нашых школ уяўляецца знак бяды, якая спрадвечна фатальным чынам суправаджае і душыць нашых жанчын. Назва гэтай бяды — сацыяльная несправядлівасць, няздольнасць грамадства гарманічна спалучыць вялікія сацыяльныя і прыродныя задаткі, якія закладзены ў самой сутнасці жанчыны. Жанчына — гэта сапраўды цэлы свет, нейкая дзіўная інстанцыя, здольная найбольш памяркоўна, гарманічна прыняць усе нягоды быцця, гэты дзікі, шалёны свет і інтэгрыраваць іх у лінію трывалых і мэтазгодных паводзін і выжывання.

Тым часам мы гаворым пра гаротны лёс і нейкую другаснасць жанчыны ў грамадстве. У чым жа справа?

МЕРА БАГАЦЦЯ, «душ предел желанный» для кожнай жанчыны, відаць, быць шчаслівай. Што такое шчасце? Адкуль яно бярэцца? «Шчаслівы той, — гаварыў Леў Талстой, — хто шчаслівы ў сябе дома». З класікам цяжка спрачацца.

Але ж як у нашым грамадстве складваюцца сямейныя адносіны? Не сакрэт, што яны не проста ў крызісным стане, а перажываюць, можна сказаць, сапраўдную катастрофу. У краіне ўжо шмат гадоў бушуе эпідэмія разводаў. У нашай рэспубліцы кожны год распадаецца звыш 30 тысяч сем'яў, а ўступаюць у сямейнае жыццё 90—100 тысяч пар. У Мінску штогод спрафіяецца каля 17 тысяч вяселляў. Але кожная трэцяя сям'я пазней развальваецца.

Шлюб ператварыўся ў нейкі своеасаблівы эксперымент, прахадны двор. У выніку ў рэспубліцы сотні тысяч разведзеных — кожны пяты дарослы чалавек. І на гэтым не спыняецца трагедыя сям'і. Паводле самых прыблізных падлікаў спецыялагаў, распадаецца толькі адна з 10—15 няшчасных сем'яў, а астатнія цягнуць ярмо нялюбага жыцця. А яшчэ ж ёсць сем'і, у якіх шчасце ўяўнае. Такіх шлюбаў да палавіны — гэта значыць яшчэ сотні тысяч няшчасных.

Мяне вельмі трывожыць тэндэнцыя на міласэрнасць апошнім часам. Не, я не супраць любой міласэрнасці. Я супраць таго, які змест у яе ўкладваецца. Больш прытулкаў дзіцяці, дамоў састарэлых! Больш розных дабрачынных фондаў! Калі справа пойдзе так і далей, то прытулкаў тых можа стаць больш, чым школ, бальніц, цэркваў. Ці тое мы робім? Усе ж гэтыя фонды, прытулкі, дамы — для пакінутых, адзіноких. Гэта прамы вынік руйнавання сям'і. Можа, гэту бяду выганяць з другога боку — з сям'і? Будзе моцнай і здаровай сям'я — не будзе адзіноких, занінутых, адвергнутых. Адпадзе і патрэба ў прытулках.

БАДАЙ, адна з самых цяжкіх праяў агоніі сямейных адносін — руйнаванне кроўных сувязей. Забыты сотні, тысячы добрых, разумных сямейных, родавых, дынастыйных традыцый, звычаяў, на якіх трымаліся і выхоўваліся цэлыя пакаленні вялікіх тварцоў, грамадзян. Ды і адкуль ведаць усё гэта маладым людзям, калі большасць іх за гады савецкай улады выраставала сіротамі?

Але галоўнай прычынай сямейных нягод, на мой погляд, з'яўляецца становішча жанчыны ў нашым грамадстве. Яно гаротнае, калі не сказаць больш, — катаржнае. Гэта толькі афіцыяльная палітыка і прапаганда больш лозунгамі, чым практычна, «узвышалі» жанчыну, у сапраўднасці ж яна заставалася прыгнечанай, забітай непасільнай працай і бытам. Тут, відаць, зрабіла сваё памылковая грамадская ўстаноўка, якая доўга панавала ў таталітарнай дзяржаве: сям'я, маўляў, справа больш асабістая, чым грамадская, хоць кожны «вялікі марксіст» і «верны ленінец» лічыў за гонар паўтараць формулу Ф. Энгельса: «Сям'я — пярвічная ячэйка грамадства». Але хто планаваў эканоміку, быт, культуру з улікам інтарэсаў і асаблівасцей сем'яў? Ніхто. Таму ў нас у вечным дэфіцыце дзіцячыя адзенне, абутак, кніжкі. Наша вялікая дзяржава была, бадай, адзіная сярод цывілізаваных краін, якая ніколі не мела і па сутнасці не мае індустрыі дзіцячага харчавання.

Пагарда да сям'і ішла з вярхоў, ад дактрынёрства. У бальшавікоў існаваў нават нейкі форс, своеасаблівы культ бясшлюбнасці. Дастаткова прыгадаць шолахаўскіх Давыдава, Нагульнава: мы, маўляў, заручоныя з адной нявестай — сусветнай рэвалюцыяй. Вядома, падполле, турмы, катарга не спрыялі наладжванню сямейнага побыту. Але і пасля рэвалюцыі пагардлівыя адносіны да сям'і захаваліся. Прыгадаем, як ставіўся да сваёй сям'і Сталін: па сутнасці ў яго і не было паўнацэннай сям'і. А жонак і блізкіх Калініна, Кагановіча, Молатава, Мікаяна і іншых сваіх паплечнікаў ён надоўга заканапаціў у турмы і ссылкі. Калі ж Іосіфу Вісарыёнавічу дакладвалі пра неталерантныя ці проста разбэшчаныя паводзіны яго бліжэйшых памочнікаў і супрацоўнікаў у адносінах да сваіх і чужых жонак, вусаты «правадыр усіх народаў і часоў» пасміхаўся: зайздросціць трэба, а не караць!

ПАЛІТЫКА ДЗЯРЖАВЫ ў дачыненні да жанчыны, а гэта значыць да сям'і, дагэтуль у нас зводзіцца па сутнасці да формулы: роўнасць полаў. Так, гэта вялікая сацыяльная заваёва нашага грамадства. Але нельга не бачыць і таго, як на справе такая «роўнасць» б'е наводмаш па «слабаму» полу. Возьмем, напрыклад, роўнасць жанчын і мужчын на прафесіі і занятасць у грамадска-карыснай працы. Так, мы доўга ганарыліся тым, што нідзе ў свеце не занята столькі жанчын у грамадскай вытворчасці, як у нас. Жанчыны ў нас і на будаўніцтве, і на цяжкіх дарожных работах. Сярод рабочых і служачых народнай гаспадаркі Беларусі жанчыны складаюць 52 працэнты, у тым ліку ў прамысловасці — 49, у сельскай гаспадарцы — 47, у будаўніцтве — звыш 30 працэнтаў.

Больш таго, жанчыны скандэнтраваны пераважна ў тых галінах прамысловасці і на тых прафесіях, дзе праца аплачваецца, як правіла, ніжэй. У выніку і сярэдні заробак жанчын на 25—30 працэнтаў ніжэйшы, чым у мужчын. Пры роўнай з мужчынамі адукацыі ў жанчыны значна менш магчымасці павышаць сваю кваліфікацыю.

Становішча жанчын намнога пагаршаецца і ад таго, што яны вымушаны займаць у народнай гаспадарцы тыя рабочыя месцы, дзе ўмовы працы найгоршыя. Возьмем хімічную прамысловасць. Яна разраслася ў рэспубліцы да вялікіх маштабаў, а спіс работ, на якіх забараняецца выкарыстоўваць працу жанчын, складзены яшчэ ў 1932 годзе, калі той прамысловасці не было.

Згодна з данымі працоўна-санітарнай экспертызы прафсаюзаў, у рэспубліцы 180 тысяч жанчын працуюць ва ўмовах, дзе запыленасць і загазаванасць паветра, шум і вібрацыя, тэмпература і вільгаць перавышаюць устаноўленыя нормы ў некалькі разоў.

Мы многа трывожымся за лёс і жыццё вязняў і заложнікаў чарнобыльскай трагедыі. Але ж амаль такі самы Чарнобыль у любым цэху, на кожным рабочым месцы, дзе кіраўнікі-гаспадарнікі і прафсаюзы няўважліва ставяцца да ўмоў працы і быту рабочых, служачых. І пакутуе ў першую чаргу жанчына.

У цэлым па рэспубліцы ў начных зменах жанчын занята на 15 працэнтаў больш, чым мужчын. А што такое начная праца для жанчыны пры такой загружанасці хатнімі клопатамі, пры хранічным недахваце месц у дзіцячых садках і яслях, пры кіламетровых чэргах у магазінах, пры адсутнасці многіх бытавых паслуг? Начная змена — Галгофа. Менавіта тут часцей за ўсё прастойвае абсталяванне, самая нізкая прадукцыйнасць працы, а брак — найвышэйшы.

Што ж атрымліваецца? Не паспее жанчына адбыць сваю начную змену, як раніцай трапляе на кавёр да майстра, начальніка змены ці цэха для прапрацоўкі за прастой, брак, а дома яе сустракае бурчанне мужа, лямант дзяцей, якіх няма каму накарміць, падрыхтаваць да школы ці працы. Сацыяльная стрэсавая сітуацыя. Кашмарнае жыццё.

Савелій ПАЎЛАЎ, прафесар.
(Заканчэнне будзе).

ПАЛЕМІЧНЫЯ НАТАТКІ

ЗЯМЛЯ. ХЛЕБ. ВОЛЯ.

3.

Разумею, думка, што калгас можа быць не ворагам, а саюзнікам фермера, выкліча ў пэўнай часткі чытачоў злую ўсмешку. Я гатоў прыслухацца да іх аргументаў. Напрыклад, такіх: адміністрацыя калгасаў, увесь вясковa - раённы наменклатурны слой выступяць супраць зямельнай рэформы, фермераў, бо іх поспех з'явіцца лепшым доказам непатрэбнасці, нежыццядзейнасці калгаснай сістэмы. З яе крахам згубяць сваю сінекуру і тыя, хто таўчэцца ля размеркавальнага карыта і корміцца працай радавога селяніна — так званыя «чырвоныя памешчыкі», розныя наглядчыкі — брыгадзіры, спецыялісты і іншы чыноўны люд. Для іх саюз з фермерам раўнасільны самагубству. У апраўданне прывядуць шэраг фактаў, спрачацца з якімі нe тое што цяжка, а немагчыма.

Так, тэндэнцыя падобных адносін да фермераў, як і наогул да новага класа ўласнікаў, аб'ектыўна існуе, але, каб яна стала дамінантай грамадскага развіцця, патрэбна адпаведная дзяржаўная палітыка — з рэвалюцыйным ухілам. Гэта калі дзяржава выступае як орган падаўлення адных на карысць іншых, а не займаецца пошукам шляхоў прымірэння, можа, і не прымірымых інтарэсаў. Дарэчы, грамадстава і стварыла яе для такой мэты, цудоўна разумеючы, што нават дрэнны сацыяльны мір лепш за «добрую» сацыяльную вайну.

Многія не без падстаў лічаць калгасы стрыжнем таталітарнай сістэмы ў вёсцы. Але ў гэтым катэгарычным сцвярджэнні апрыоры адмаўляецца магчымасць іх самарэфармавання. Новыя формы гаспадарання, з'яўленне цэлага класа ўласнікаў хочаш — не хочаш, а прымусяць унесці істотныя карэктывы і ў арганізацыю такіх гаспадарак, і ў адносіны паміж іх членамі. Гэта ж можна сказаць і пра ўзаемаадносіны фермераў і калгасаў. Не дай Бог паўтарыць нам албанскі і балгарскі варыянт. Ды і літоўскі таксама.

Пры сённяшніх умовах і цэнах трэба зазначыць, што без дапамогі калгаса фермеру не абысціся. Першы можа ўзяць на сябе сервіснае абслугоўванне фермера. Тэхніка, насенне, прычапныя прылады, гной, нарэшце, выкананне асобных палявых работ, распілоўка лесу — гэта толькі малы пералік таго, што можа стаць неперaадольнай перашкодай у станаўленні яшчэ аднаго кармільца краіны — фермера. Спадзяюся, мае апаненты ўстрымаюцца ад контрдоваду: усё гэта зробіць дзяржава, а ад канкурэнта чакаць такіх падарункаў няварта. Калі фермера і калгас мы зробім ворагамі, то згодзен. Але задачу дзяржавы, сумленных партый і палітыкаў, прэсы ў тым і бачу, каб яны ўсімі сіламі не дапусцілі процістаяння. Дадам, мудрымі і дэмакратычнымі сродкамі.

З другога боку, фермер — гэта той шчупак, які не дасць драмаць карасю. 10—15 на калгас, а на Беларусь 15—20 тысяч новых гаспадароў, злых да работы, ініцыятыўных, умелых, зробяць тое, што ні ўказам, ні стрэльбай ніколі не зробіш: рэформа стане незваротнай. Але і тут не трэба ілюзій. Фермерства, як і ўсякая новая, цяжкая справа, абрастае мускуламі не ў адзін дзень. Будуць банкруцтвы, няўдачы, хтосьці свой надзел прап'е, другі яго прыкупіць, хтосьці ні фізічна, ні маральна не вытрымае катаржнай працы на зямлі і збудуе капцільню ці маслабойню... Што ж, гэта будзе нармальнае жыццё, не па кніжцы, не па загаду чарговага правадыра, а па ўласнаму выбару.

Іншымі стануць і калгасы. Яны і зараз так структурна ўладкаваны, што без асаблівай ломкі могуць быць рэарганізаваны ў кааператывы з уласным капіталам. Ферма, майстэрня, мехдвор, аўтапарк, сталовая, лазня, дзіцячы сад, кармацэх, цэхі падсобных промыслаў могуць стаць уласнасцю тых, хто там працуе. Нехта купіць за свае прыватызацыйныя чэкі зямлю, а нехта ад яе адмовіцца, стане саўладальнікам майстэрні, будзе рамантаваць таму ж фермеру тэхніку. За плату, канешне. Але ўсё гэта селянін павінен выпакутаваць сам, без загадаў зверху, знізу ці збоку Прыспешваць ці тармазіць яго будзе эканамічная сітуацыя, выгада, пэўная дзяржаўная палітыка.

І яшчэ. Ёсць калгасы, якія, па майму разуменню, прыватызацыі не падлягаюць. Іх нельга падзяліць. Гэта — магутныя комплексы. Напрыклад, на 10 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы ці на 108 тысяч свіней. У гэтых гаспадарак свой лёс і вызначаць яго павінны самі калгаснікі.

Я не гавару ўжо пра сацыяльны комплекс. Ён першы пацярпеў ад бяздумнай лібералізацыі. У многіх калгасах закрыліся дзіцячыя садкі. Іх утрыманне патрабуе такіх грошай, што гаспадарцы выгадней даплачваць аднаму з бацькоў нейкую суму, каб сядзелі з дзецьмі дома. Але калі ўсе будуць сядзець па хатах, то хто выйдзе ў поле? Тая ж сітуацыя склалася з дамамі культуры. Вёскі засталіся без кіно, без сустрэч з тэатральнымі калектывамі, знікаюць самадзейныя калектывы... Што ж тады застаецца беднаму селяніну, няхай і фермеру?

Некаму можа здацца, што аўтар стаў на абарону калгасаў. Не, гаворка ідзе ў рэшце рэшт не пра калгасы і не пра фермераў. Гаворка ідзе пра Беларусь. Пра маладую дзяржаву, якая толькі-толькі становіцца на ногі, выпрацоўвае самастойную палітыку, шукае падтрымку сваім памкненням да незалежнасці і суверэнітэту ў іншых краінах. Мы бачым, з якімі цяжкасцямі сутыкаюцца на гэтым шляху нашы далёкія і блізкія суседзі. Горкія ўрокі Грузіі, Арменіі і Азербайджана, Малдавіі, Прыбалтыкі, свае ўласныя павінны навучыць нас мудрасці. Не маю нічога супраць Антыкрызіснага камітэта, які створаны з мэтай сумесных дзеянняў розных плыняў пры пагрозе агрэсіі звонку. Але, скажу прама, мы зусім не гаворым аб пагрозе нашай маладой дзяржаўнасці, нацыянальнаму адраджэнню, якая зыходзіць не звонку, а мае ўнутраны характар.

Зараз Беларусь — гэта востраў стабільнасці ў штармавым акіяне. Хоць маленькімі крокамі, спатыкаючыся (не без гэтага), павольна, але мы маем магчымасць ладзіць сваё жыццё. З намі размаўляюць, жадаюць супрацоўнічаць, зычаць поспеху не таму, што мы дзейнічаем нерашуча ці занадта рашуча, а менавіта таму, што ў нас стабільная сітуацыя. Стабільная не ў сэнсе кансервацыі таталітарнага парадку, а ў сэнсе грамадзянскага міру.

Што можа яго ўзарваць? А разам з ім знішчыць і парасткі нашай дзяржаўнасці? Міжнацыянальны канфлікт? Малаверагодна. Дзякуй Богу, у нас няма прычын для катаклізмаў падобнага роду. Але сацыяльны мір можа быць парушаны непрадуманай дзяржаўнай палітыкай па пераходу да рынку, вынікам якой могуць стаць голад, эканамічны хаос, масавае беспрацоўе. Вось чаму партыі і рухі, дэпутаты і члены ўрада, усякія аматары паспешнай, як на пажары, дзяльбы народнага дабра, калі яны дбаюць пра будучыню незалежнай і суверэннай Беларусі, павінны быць вельмі і вельмі асцярожнымі ў сваіх закліках і праграмах. Гэта менавіта той выпадак, дзе асцяражнасць — вышэйшая мера мужнасці. Змена дзяржаўнага ладу, праблемы ўласнасці не вырашаюцца ў адзін дзень, на эмоцыях, на праведным гневе! Зямля, хлеб, воля — тыя дрожджы, на якіх замешвалася большасць рэвалюцый. Але ці той гэта шлях, па якім мы павінны ісці?

Не, не трэба больш рэвалюцый. Інакш у нас ніколі не будзе ні зямлі, ні хлеба, ні волі.

Міхаіл МІХАЕВІЧ.

БАРЫС МІКАЛАЕВІЧ — НЯЎМОЛЬНЫ

ГОМЕЛЬ (**У. Пернікаў**). Неверагодныя цяжкасці навaліліся на мінулым тыдні на шэраг прамысловых прадпрыемстваў абласнога цэнтра. Вытворчае аб'яднанне «Водаканал», як кажуць, перакрыла ім дыханне. А калі быць больш дакладным — адмовіла ў падачы вады. А без яе, вядома, і не туды, і не сюды. Вось чаму тэлефоны ў кабінеце галоўнага інжынера аб'яднання Б. Зяленіна літаральна разрываліся. Але той быў няўмольны: вады не атрымаеце.

— Чаму? — пацікавіўся і я ў Барыса Мікалаевіча.

— Гэта не капрыз, —адказаў ён. — Рынак моцна ўзяў і нас за зябры, вось мы і выкручваемся. Вымушаны выкручвацца, каб на паўмільённае насельніцтва горада не навалілася эпідэмія розных хвароб.

Агульнавядома, што для дэзінфекцыі вады прымяняюцца такія рэагенты, як хлор і каагулянты. Хлор гамяльчане набываюць у Харкаўскай, а каагулянты — у Сумскай абласцях суседняй Украіны. Але там патрабуюць папярэднюю плату. Сотні тысяч рублёў адразу аб'яднанне выплаціць не заўсёды можа, бо жыццё ў ім ледзь тлее. А такія заводы, як ліцця і нармаляў, «Гомсельмаш», «Кaрал» і радыётэхналагічнай аснасткі, за карыстанне вадой не выплацілі яму 18 з палавінай мільёнаў рублёў. Між тым рэагенты на зыходзе, і недахват іх можа катастрафічна адбіцца на ачыстцы вады для жылых мікрараёнаў. Дзе ж выйсце?

— Рынак для ўсіх ёсць рынак, — кажа Барыс Мікалаевіч. — І трэба, каб усе лепш думалі аб сваім выжыванні.

Адказ, як бачым, у духу знакамітага цёзкі Б. Зяленіна — Прэзідэнта Расіі.

наша жыццё толькі пачынаецца зараз»

Алег МАНАЕЎ: «Я — аптыміст:

Алегу Манаеву 40 гадоў. Сам ён лічыць, што гэта ўжо мнагавата, каб пачынаць жыццё нанава, і па-добраму крыху зайздросціць тым, каму яшчэ няма трыццаці, у каго больш шанцаў перайначыць да лепшага не толькі сваё жыццё, але і жыццё грамадства. І тым не менш Алег Цімафеевіч не губляе аптымізму і ўпэўненасці ў сабе. У яго моцная прага да тых здзяйсненняў, якія — так лічыць ён — адкрыюць перспектывы да лепшага, нягледзячы на тое, што шлях да гэтага лепшага пралягае праз доўгія і цяжкія гады выпрабаванняў, складанасцей і нават пакут. Загартоўваюць у ім гэтую веру і спадзяванні аб'ектыўная ацэнка нашага мінулага і цяперашняга...

За плячамі ў Алега Цімафеевіча ўжо зараз даволі многа ўсяго. Ён — доктар сацыялагічных навук, галоўны навуковы супрацоўнік Белдзяржуніверсітэта. У галіне сацыялогіі і сродкаў масавай інфармацыі працуе амаль 20 гадоў. Апублікаваў каля 80 навуковых прац па гэтай праблематыцы, у тым ліку ў вядучых часопісах Захаду. Выступаў з лекцыямі ў розных універсітэтах Францыі, Югаславіі, Вялікабрытаніі, Канады і ЗША. У 1991 годзе па кантракту з ЮНЕСКО падрыхтаваў аналітычны даклад аб развіцці альтэрнатыўных сродкаў масавай інфармацыі ў СССР. Член Міжнароднай асацыяцыі па вывучэнню масавай камунікацыі.

У 1990 годзе стаў адным з ініцыятараў стварэння Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі (АДПБ). На яе І з'ездзе выступаў з дакладам па статуту. Зараз — член экспертнага савета АДПБ.

Але... афіцыяльна не з'яўляецца членам ніводнай з існуючых зараз партый.

Вясной 1992 года разам са сваімі калегамі і аднадумцамі стварыў Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД) і стаў старшынёй яго праўлення.

Як бачым, паслужны спіс даволі вялікі. Але нас цікавіць Алег Манаеў найперш як старшыня праўлення НІСЭПД. Таму першае пытанне пра інстытут.

— Алег Цімафеевіч, ад каго і ад чаго незалежны ваш інстытут?

— НІСЭПД з'яўляецца недзяржаўнай, некамерцыйнай арганізацыяй і ўяўляе сабой альтэрнатыву афіцыяльнай, па-ранейшаму ідэалагізаванай і залежачай ад улад сацыяльнай навукі. Яго заснавальнікамі сталі структуры недзяржаўнай эканомікі і прыватныя асобы. Усе людзі маладыя (33—34 гады). Некаторыя з вельмі добрымі, свежымі мазгамі, зусім неабыякавымі ідэалагемамі, з якіх, магчыма, атрымаюцца нашы беларускія Яўлінскія. Многія з іх кандыдаты навук. І наша незалежнасць базіруецца не толькі на тым, кім і як інстытут заснаваны, але і на тым, хто і як у ім працуе.

— Вы лічыце, што ў нас мала структур, якія займаюцца сацыялагічнымі даследаваннямі?

— Есць шмат усялякага роду службаў, якія займаюцца апаратыўным вывучэннем грамадскай думкі, збіраюць адказы на пытанні: хто што сказаў. Гэта важна і патрэбна, толькі атрымліваецца вельмі павярхоўны аналіз таго, што адбываецца. Наш інстытут арыентуецца на фундаментальныя сацыялагічныя навуковыя даследаванні. Распачатыя пяць праектаў будуць завершаны на працягу аднаго года. Мы бачым сваю задачу не ў тым, каб проста сказаць, хто як ацэньвае рэальнасць, а каб зазірнуць за кулісы сённяшняга дня і выявіць скрытыя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя механізмы грамадскага жыцця. Таму рэжым нашай работы будзе адрозніваца ад традыцыйнага. З кожным праектам працуюць 5—6, максімум 7 чалавек. Паколькі залежнасць гэтых людзей ад сістэмы значна ніжэйшая, чым у іншых, гэта дазволіць ім дастаткова аб'ектыўна падыходзіць да тых праблем, якімі мы займаемся.

— Супрацоўнікі вашага інстытута ці то лідэры, ці то члены той ці іншай партыі...

— Наш інстытут не палітычная арганізацыя, а даследчая. І мы ў палітычных акцыях гэтых партый не ўдзельнічаем. У нас проста задзейнічаны людзі, якія добра ведаюць праблемы дэмакратызацыі і рыначных адносін і даказалі сваю прыхільнасць да іх. Вы можаце спытаць, чаму мы не запрашаем чалавека з КДБ ці ўрада, які займаецца пытаннямі эканомікі. Вельмі проста: хоць тыя ці іншыя людзі старой сістэмы і з'яўляюцца прафесіяналамі, але калі мы ведаем, што яны перашкаджалі развіццю дэмакратыі і рыначных адносін, то да супрацоўніцтва з імі не імкнёмся. Хоць асобныя рабочыя кантакты магчымыя. Толькі я не хачу, каб у вас склалася ўражанне, што гэта нейкая пазіцыя, якая прыняла такую форму. Мы ведаем, што ва ўрадзе і іншых дзяржаўных структурах дастаткова разумных людзей, прагматыкаў, і мы гатовы да супрацоўніцтва з імі. Асабліва калі зараз такія людзі спрыяюць сваёй дзейнасцю развіццю дэмакратызацыі і рыначных адносін.

— Вы адсасабляеце «людзей старой сістэмы». Але ж мы ўсе жылі і фарміраваліся пад уплывам і ў асяроддзі гэтай сістэмы. Чаму вы лічыце, што супрацоўнікі вашага інстытута нейкае выключэнне? Як яны маглі пазбегнуць уплыву гэтай сістэмы і стаць нейкімі адметнымі?

— Гэтыя людзі, і я ў тым ліку, на працягу многіх гадоў падтрымлівалі кантакты з некаторымі вядомымі дысідэнтамі ў Маскве, Ленінградзе, Прыбалтыцы. Мы чыталі літаратуру, якой зараз нікога не здзівіш, яшчэ ў пачатку 70-х. Прычым, мы рабілі стаўку на палітычную літаратуру: «Архіпелаг ГУЛАГ», кнігі Джыласа «Новы клас», Лўтарханава «Тэхналогія ўлады», Валянціна Турчына «Інерцыя страху», Валерыя Чалідзе «Будучае Расіі», Шрагіна «Процістаянне духу». Некаторыя да сённяшняга дня не апублікаваны ў нас. Мы чыталі іх, абмяркоўвалі. На вялікі жаль, частка людзей таго кола не дачакалася сённяшняга дня і эмігрыравала.

— Якія задачы вы ставіце перад сваім калектывам?

— Каб лепш зразумець іх, я назаву праекты, з якіх мы пачалі сваю дзейнасць. Іх пяць: сродкі масавай інфармацыі ў пераходным грамадстве (ад таталітарызму да дэмакратыі), новыя суб'екты палітыкі і эканомікі Беларусі, фінансавыя рынкі Беларусі, рабочы рух Беларусі: гісторыя сучаснасці, развіццё беларускай нацыі пры пераходзе ад таталітарызму да дэмакратыі. Гэта ўсё вельмі аб'ёмныя праекты, разлічаныя на доўгі час. Паколькі работа над праектамі толькі пачалася, то рабіць нейкія вывады не бяруся. Скажу толькі, што тым, хто дае адназначныя ўпэўненыя ацэнкі і прагнозы, нельга верыць. І сумленны вучоны за такое не возьмецца.

— На што вы спадзяецеся ў жыцці?

— Надзеі і мае асабістыя, і маіх калег па інстытуту заснаваны на тым, што і ў Беларусі, і ў былым СССР пачынаецца працэс фарміравання грамадзянскага грамадства. Гэта значыць, што пачалі ўзнікаць новыя незалежныя сацыяльныя суб'екты: у палітыцы — партыі і рухі, у эканоміцы — розныя формы прадпрымальніцтва, у культуры — розныя нацыянальна-культурныя таварыствы і г. д. У старым грамадстве ў строга навуковым сэнсе суб'ектам была толькі дзяржава ў цэлым. Па Гегелю грамадзянскае грамадства — публічная сфера прыватных інтарэсаў. Калі ўзнікаюць умовы і магчымасці для выяўлення гэтых інтарэсаў. Дык вось, гэты працэс, гаворачы мовай незабыўнага прэзідэнта, пайшоў. І стрымаць яго ўжо немагчыма нават цаной крыві. У Беларусі ён ідзе марудней, чым у большасці рэгіёнаў, у асноўным па дзвюх прычынах: яшчэ ў сіле элементы старой таталітарнай сістэмы і ўзнікаюць квазі- або псеўдановыя суб'екты. Суб'екты, якія чалавек можа прыняць за сапраўды новыя суб'екты грамадзянскага грамадства, але калі да іх прыгледзецца больш уважліва, то можна ўбачыць, што гэта ўсё ўжо было.

— Якіх палітычных поглядаў вы прытрымліваецеся?

— Я, як і мае калегі па інстытуту, лічу сябе лібералам. Але не ў тым сэнсе, які разумеюць лібералаў у нашым грамадстве. Лібералізм — гэта тая сістэма, якая на Захадзе была прадстаўлена М. Тэтчэр, Г. Колем, Р. Рэйганам. Згодна з іх пунктам погляду, грамадства — самарэгулюемая сістэма: у ім самі сабой адбываюцца спантанныя працэсы ва ўсіх сферах. Сістэма развіваецца сама па сабе. Для ажыццяўлення гэтых спантанных самарэгулюемых працэсаў патрэбны суб'екты — незалежныя чалавек, арганізацыя, інстытут. Вось яны і пачнуць рэгуляваць. А ў нас грамадства было монасуб'ектам. Зараз наша задача — дыферэнцыраваць грамадства. Работа інстытута накіравана на тое, каб дапамагаць, спрыяць узнікненню і развіццю названых суб'ектаў. Гэта вельмі складана. Паступовае развіццё можа адбыцца сама меней за змену аднаго пакалення. Раней я думаў, што трэба ўсё зламаць. Паездкі за мяжу пераканалі мяне ў тым, што ўсё павінна рабіцца менавіта паступова, крок за крокам, перасоўваць нельга. Я ўсвядоміў, што шлях да новага вельмі доўгі. Але на ўсё трэба мець цярпенне.

— Што галоўнае ў праграме інстытута?

— Прыярытэт правоў асобы над усімі астатнімі правамі. Размовы пра грамадска-палітычныя каштоўнасці — бяссэнсавыя. Ну і абмежаванне правоў дзяржавы. Яе трэба разглядаць як інстытут, які забяспечвае правы асобы.

— Што вы думаеце наконт дэмакратыі ў нас?

— Усё, што мы маем, — гэта вынікі ўсяго папярэдняга развіцця. Дэмакратыі ў нас няма.

— Хто фінансуе інстытут?

— Пакуль што мы існуем на ўстаўны фонд, і нашы заснавальнікі — юрыдычныя асобы — уносяць некаторыя сумы на рахунак інстытута. Што будзе далей? Пытанне адкрытае. Мы арыентуемся на новыя суб'екты — у палітыцы і эканоміцы. Ад палітычных няма чаго чакаць. Што датычыцца бізнесу, то тут мы спадзяёмся на падтрымку. Хоць Саву Марозава цяжка знайсці. Усе хочуць мець выгаду адразу. Мы вядзём таксама перагаворы з замежнымі фондамі і арганізацыямі. Магчыма, што гэта стаўка акажацца больш надзейнай.

— Якія перспектывы вы бачыце, якая будучыня, па-вашаму, нас чакае?

— Я зрабіў бы аналогію з Германіяй і нямецкім народам 45-га года. Шмат гадоў нямецкая нацыя плаціла страшную цану за тое, што выбрала не тую гістарычную дарогу. Тады ў іх было яшчэ горш, чым у нас. Да 1985 года адчуванне безнадзейнасці валодала намі цалкам. Гістарычнай перспектывы не было. Зараз мы плоцім такую ж цану. І мы павінны яе заплаціць усю.

Можа вось такое адчуванне жыцця больш нас аб'яднае, чым чыста прагматычныя мэты. І мы вернемся на тую дарогу, па якой ідзе ўся цывілізацыя.

Марыя ДАБЖЫНСКАЯ.

РОЗГАЛАС

ЛЕНІН З'ЯЗДЖАЕ З ВУЛІЦЫ ВЯЛІКАЙ

ПОЛАЦК (Сяргей Маліноўскі, БелаПАН). Экспертная група камітэта па культуры Полацкага гарсавета прапанавала вярнуць вуліцам іх традыцыйныя назвы: Леніна — Вялікая, Маркса — Ільінская і Крывічанская, Талстога — Прабойная. У бліжэйшы час на карце горада з'явяцца вуліцы Крыжовая, Старавакзальная, Рыжская. На будучае таксама вырашана аддаваць перавагу дарэвалюцыйным назвам вуліц.

МАНАСТЫРСКІЯ КЕЛЛІ АЖЫЛІ

У Пінску да кіношнікаў прывыклі ўжо. Рэжысёраў вабяць сюды цудоўны краявід, старажытныя гарадскія кварталы з самабытнай архітэктурай. Але ўпершыню здымачнай пляцоўкай сталі келлі славутага Езуіцкага калегіума, пабудаванага ў пачатку XVIII стагоддзя. Галоўны корпус калегіума добра захаваўся. Зараз тут поўным ходам ідзе рэканструкцыя.

Вядомы беларускі кінарэжысёр Барыс Сцяпанаў абраў гэты помнік архітэктуры для здымак чатырохсерыйнай стужкі «Д'яблу і Богу». У цэнтры будучай карціны — вобраз нашага земляка, мысліцеля і вучонага XVII стагоддзя Казіміра Лышчынскага. За атэістычныя погляды сеймавы суд прыгаварыў яго да пакарання смерцю — спальвання. Ролю К. Лышчынскага выконвае пецярбургскі акцёр Міхаіл Марозаў, а магната Радзівіла іграе Яроменка-малодшы.

КОННЫМ РЭЙДАМ—НА МАЛДОВУ

РЭЧЫЦА (**У. Пернікаў**). Нярэдкія выпадкі крадзяжу з калгасных і саўгасных фермаў свіней, цялят, коней, іншай жывёлы насці заканчваліся для зладзеяў шчасліва: вельмі спрытна замяталі яны сляды.

Але на гэты раз зламыснікі, як кажуць, трапілі ў пастку. Імі аказаліся маладыя хлопцы Г. Голбан і Ю. Самбрыш. Глыбокай ноччу яны вывелі двух гнядых з хлява калгаса імя Фрунзе і галопам адправіліся ў конны рэйд на радзіму, у Малдову, адкуль быццам бы прыбылі наймацца ў гэтую гаспадарку на работу. Ды выйшла прамашка!

«ИНТЕРФАКС» ПАВЕДАМЛЯЕ

100 ТЫСЯЧ ТОН КАРМАВОГА ЗБОЖЖА ДЛЯ МАСКОЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Урад Расіі даў даручэнне ў тэрміновым парадку заключыць кантракты на закупку за мяжой на працягу чэрвеня—ліпеня 100 тысяч тон кармавога збожжа для Маскоўскай вобласці. Там няма чым карміць жывёлу. Кантракты, якія заключаюцца праз знешнегандлёвае акцыянернае таварыства «Экспартхлеб», будуць аплачаны за кошт выручкі ад экспарту 500 млн. куб. м. прыроднага газу.

АРГЕНЦІНСКАЕ ПАСОЛЬСТВА ПЕРАСЦЕРАГАЕ АБ ФАЛЬШЫВЫХ АНКЕТАХ ДЛЯ ЭМІГРАНТАЎ

Пасольства Аргенціны ў Маскве папярэдзіла аб тым, што іміграцыйныя анкеты, якія прадаюцца на вуліцах з рук, з'яўляюцца фальшыўкамі. Згодна з паведамленнем для друку, тэкст і «шапка» на кантрабандных анкетах для эмігрантаў ў Аргенціну не адпавядаюць афіцыйна прынятым формам.

Пасольства назвала продаж падробных бланкаў «незаконнымі дзеяннямі» і «падманам» грамадзян былых савецкіх рэспублік. Аргенціны прапанавалі мясцовым уладам прыняць «адпаведныя меры».

МАСКВЕ ПАТРЭБЕН СВОЙ ГАЙД-ПАРК

Старшыня Массавета Мікалай Ганчар заявіў карэспандэнту «Інтэрфакса», што ў горадзе даўно час вызначыць пляцоўку для правядзення мітынгаў, якая стала б своеасаблівым маскоўскім Гайд-паркам. Ён выказаў гатоўнасць прыняць удзел ва ўрэгуляванні сітуацыі вакол тэлецэнтра, бо, на яго думку, гаворка можа зайсці аб пачатку грамадзянскай вайны. Там неаднаразова нацыянал-патрыёты з «Працоўнай Расіі» і «Рускай партыі» арганізавалі пікеты пад лозунгам «Русскім — рускае тэлебачанне» і насуперак забароне гарадскіх улад разбілі палаткавы лагер.

БЫЛЫ СТАРШЫНЯ ГРУЗІНСКАГА ПАРЛАМЕНТА ВЫКАЗВАЕ НЕДАВЕР ДЗЯРЖАВЕЦУ

Былы старшыня парламента Грузіі Акакій Асацыяні ад імя ўзначальваемага ім Саюза традыцыяналістаў выказаў недавер да Дзяржаўнага савета, які ўзначальвае Эдуард Шэварднадзе. Яго заява распаўсюджана ў Тбілісі. На думку А. Асацыяні, Дзяржавет не можа прыняць дзейсных палітычных мер па ўрэгуляванню канфлікту ў Паўднёвай Асеці, дзе «на волю лёсу пакінуты абаронцы грузінскай зямлі». Ён таксама лічыць, што «капітулянцкі дух згубны для Грузіі. Ён можа прывесці да трагічных страт».

ПЕЦЯРБУРГ І ВОБЛАСЦЬ ДЗЕЛЯЦЬ МАЁМАСЦЬ КПСС

Улады Санкт-Пецярбурга і вобласці распрацавалі праграму раздзелу маёмасці КПСС паміж горадам і вобласцю прапарцыянальна колькасці членаў партыі ў абласной і гарадской арганізацыі па стану на жнівень 1991 года. Пра гэта паведамлена на прэс-канферэнцыі ў Пецярбургу.

Перад путчам у горадзе была 431 тысяча камуністаў, у вобласці 94 тысячы. Зыходзячы з гэтых лічбаў, горад павінна адысці маёмасці на 8 мільёнаў рублёў (у цэнах на момант будаўніцтва аб'ектаў), вобласці — на 6,5 мільёна рублёў. У сумеснае карыстанне горада і вобласці будзе перададзена маёмасці на 56 мільёнаў рублёў.

Праграма раздзелу вынесена на сумеснае пасяджэнне сесій гарадскога і абласнога Саветаў.

На прэс-канферэнцыі было заяўлена, што цяперашнія камуністычныя партыі, якія прэтэндуюць на ідэалагічную пераемнасць, не атрымаюць нічога з маёмасці былой КПСС. Аднак у выпадку рэабілітацыі КПСС гэта маёмасць будзе ёй вернута.

У Санкт-Пецярбургу на грошы КПСС было пабудавана 12 аб'ектаў, у Ленінградскай вобласці—25.

НА СЛУЖБУ РАЗАМ З МУЖАМ

ВАЛОЖЫН. Як паведамілі мне ў райваенкамаце горада, у мінулым годзе на тэрміновую ваенную службу было прызвана 18 жанчын. У гэтым годзе пакуль толькі 7. Усе яны — жонкі ваеннаслужачых мясцовага гарнізона. Што ж прымушае лепшую палавіну чалавецтва апранаць на сябе ваенную форму? Магчыма, не толькі бязмежная адданасць мужам і нежаданне разлучацца з імі на некалькі гадзін. Ёсць на тое і іншыя прычыны, напрыклад, нізкія аклады ў некаторых грамадзянскіх установах, пагроза звальнення па скарачэнню і да т. п.

Ну, а ці прызываюцца на службу незамужнія дзяўчаты? За апошні час у Валожынскім райваенкамаце такіх выпадкаў не было. Асноўная прычына — боязь трапіць у аддаленыя гарнізоны, а ў мясцовых для іх пакуль месцаў не знаходзіцца.

Уладзімір ЦАСЮК.

У ПРОРАЗІ ПРЫЦЭЛА— СЛУЖБОВЫЯ ЗЛОЎЖЫВАННІ

Прэс-цэнтр Беларускага згуртавання вайскоўцаў (БЗВ) паведамляе, што ў сувязі з паступленнем інфармацыі з воінскіх часцей і гарнізонаў аб выкарыстанні службовымі асобамі ў войсках у асабістых мэтах (узбагачэнне, будаўніцтва катэджаў, дач, гаражоў, апрацоўкі дачных участкаў і г. д.) ваеннай тэхнікі, маёмасці і ваеннаслужачых тэрміновай службы, у тым ліку грамадзян Рэспублікі Беларусь, прычым у службовы час, Каардынацыйны савет БЗВ на сваім пасяджэнні разгледзеў гэтую праблему. Ён палічыў неабходным прыняць адпаведныя меры, накіраваныя на выключэнне з армейскага жыцця фактаў, якія дыскрэдытуюць у вачах беларускага народа Узброеныя Сілы рэспублікі.

З прычыны таго, што асабовы састаў часцей і падраздзяленняў у значнай ступені дэзарганізаваны, не мае веры ў магчымасць адстаяць свае правы з дапамогай адпаведных камандзіраў (начальнікаў) і органаў юстыцыі, Каардынацыйны савет БЗВ прыняў зварот да міністра абароны Рэспублікі Беларусь аб неабходнасці выдання адпаведнага загада (дырэктывы) наконт забароны незаконнага выкарыстання службовага становішча ў асабістых інтарэсах службовымі асобамі ўзброеных сіл. Унесена таксама прапанова аб выкараненні камерцыйнай дзейнасці ў воінскіх часцях і ўстановах.

ШТО АДБЫВАЕЦЦА Ў «ЗНАМЕНИ ЮНОСТИ»?

Тысячы падпісчыкаў папулярнай газеты «Знамя юности», як і іншыя жыхары рэспублікі, напэўна, здзівіліся, убачыўшы, што апошнія нумары выдання падпісвае да друку не галоўны рэдактар Павел Вераб'ёў, а шэф-рэдактар Міхаіс Кацюшэнка. Адны палічылі гэта «пераваротам газетнага маштабу», другія падумалі, што так і трэба, а трэція наогул нічога не зразумелі. Што ж здарылася на самай справе?

У апошнія месяцы «Знамя юности» перажывала не лепшыя часы. Колькасць падпісчыкаў скарачалася, зарплата рэдакцыйнага калектыву знаходзілася на мінімальным узроўні, фінансавы стан газеты быў вельмі няпэўны. Больш таго, тагачасны ЛКСМБ адмовіўся ад заснавальніцтва і перадаў правы на выбар заснавальніка калектыву рэдакцыі. Таму «Знамя юности» пэўны час знаходзіцца не толькі без заснавальніка, але нават не зарэгістравана як сродак масавай інфармацыі ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь, якое мела поўнае права закрыць газету ў любы момант. У гэтых умовах галоўны рэдактар Павел Вераб'ёў вырашыў стварыць акцыянернае таварыства з удзелам некаторых камерцыйных структур Беларусі. Народны дэпутат РБ Сяргей Навумчык у газеце «Свободные новости» нават паспрабаваў абвінаваціць «Знамя юности» ў пошуку апекуноў і зрашчэнні з прадстаўнікамі бізнесу. Аднак дарэмна, бо калектыў маладзёжнай газеты своечасова зразумеў, што стварэнне акцыянернага таварыства ставіць «ЗЮ» ў залежнасць ад камерцыйных структур.

Гэты, а таксама вышэйпрыгаданыя факты, звязаныя з тыражом, зарплатай і заснавальніцтвам, вымусілі прафбюро газеты склікаць агульны сход, на якім галоўнаму рэдактару Паўлу Вераб'ёву быў выказаны недавер. Прадстаўнікі газеты звярнуліся да Міхаіла Кацюшэнкі, які ў сярэдзіне 80-х гадоў працаваў рэдактарам «Знамени юности», а апошні час займаў адказную пасаду ў часопісе «Крыніца», з просьбай узначаліць рэдакцыйны калектыў. Міхаіл Пятровіч даў згоду, таму на чарговым агульным сходзе ён і быў зацверджаны на пасадзе шэф-рэдактара газеты.

Паводле слоў Міхаіла Кацюшэнкі, ён згадзіўся вярнуцца ў «ЗЮ» толькі таму, што гэта была прапанова калектыву рэдакцыі, а не загад нейкіх інстанцый.

Міхаіл Кацюшэнка адзначыў, што, улічваючы неаданне калектыву стварыць акцыянернае таварыства з удзелам камерцыйных структур, зараз вядзецца пошук заснавальнікаў з ліку дзяржаўных арганізацый. На думку карэспандэнта «Звязды», заснавальнікам маладзёжнай газеты хутчэй за ўсё выступіць Савет Міністраў РБ, аднак у любым выпадку калектыў рэдакцыі будзе сузаснавальнікам. Ну, а былы галоўны рэдактар Павел Вераб'ёў зараз знаходзіцца ў адпачынку, пасля чаго пытанне аб яго новай пасадзе будзе вырашацца ўнутры самой рэдакцыі. У межах новага штатнага раскладу.

Станіслаў СУЛКОЎСКІ.

«БАСОВІШЧА-92»

У другой дэкадзе ліпеня на працягу трох дзён — з 17 па 19 — у Польшчы, пад Беластокам, адбудзецца трэці музычны фестываль маладой Беларусі, арганізаваны Беларускім аб'яднаннем студэнтаў (БАС) Польшчы (адсюль і назва — «Басовішча-92») і вядучым хіт-парада радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная» Віталем Сямашкам. У фестывалі прымуць удзел вядучыя беларускія групы і выканаўцы, барды, а таксама прадстаўнікі беларускай дыяспары з розных куткоў свету.

НАВАГРУДСКІЯ НАВІНЫ

У горадзе самым «праслаўленым» ужо даўно лічыцца мікрараён Паўднёва-Заходні. Тут часцей за ўсё бываюць розныя здарэнні.

Школа № 6, якая «прапісана» ў гэтым раёне Навагрудка, стараецца не «адставаць» ад часу, таму ў ёй рэгулярна адбываецца штосьці відавочнае і неверагоднае.

Яшчэ свежы ў памяці выпадак, калі на яе тэрыторыі вучнямі сярэдніх класаў былі вырваны з карэннямі маладыя дрэўцы. А цяпер «пастараліся» выпускнікі. «Замачыўшы» свае атэстаты, яны палічылі, што вокны на першым паверсе школы — гэта вялікая раскоша. Таму, узброіўшыся камянямі і палкамі, у адзін момант павыбівалі шыбы.

***

У гэтым жа раёне і прыкладна ў гэты ж час ціха клаліся спаць тры польскія бізнесмены, якія працавалі тут па кантракту з адной фірмай. Прачнуўшыся раніцай, ім нічога не заставалася рабіць, як крычаць на ўсю моц: з іх асабістых машын былі зняты колы.

***

Нядаўна аб'яднанне «Агульнахарч» пры райспажыўсаюзе пачало выпякаць свой хлеб. Цяпер, акрамя пірагоў і кексаў, прадпрыемствы, школьныя сталоўкі будуць атрымліваць чорныя боханы. Праўда, цана хлеба трохі вышэй, чым у магазінах. Але ж у цэлым для аб'яднання ён каштуе танней, таму што раней нямала грошай затрачвалася на транспарт.

АДНАК І АПЕТЫТ У ВАС, ПАНОВЕ!

Вось якую гісторыю паведаміла сваім чытачам пружанская газета «Раённыя будні». Філіял Брэсцкага камерцыйнага банка ў Пружанах, які ўзначальваў былы другі сакратар райкома партыі У. М. Граб, перш чым як след разгарнуць сваю дзейнасць, сутыкнуўся з мноствам праблем. Галоўная з іх — дзе размясціцца. Але ў пошуку памяшкання банкіры не доўга білі ногі: спадабаліся ім канторы, якія ў новым будынку Пружанскага сельскага Савета займалі таварыствы сляпых і інвалідаў, і яны «ветліва» папрасілі гаспадароў выселіцца. Раённыя ўлады падтрымалі банкіраў, а інвалідам выдзелілі кабінеты ў халодным і сырым, патрабуючым капітальнага рамонту будынку ў гарадскім парку.

Прыйдзецца высяляцца са сваіх кабінетаў таксама таварыству аўтааматараў і аддзяленню міліцыі. Ці дойдзе справа да самога сельскага Савета? Калі меркаваць па сённяшнім размаху банкіраў, то ўсё можа быць...

БелаПАН.

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

Ліквідацыя— гэта яшчэ не канец

У пачатку чэрвеня кожны з амаль 1.100 творчых супрацоўнікаў (у адрозненне ад тэхнічных і гаспадарчых) Беларускага тэлебачання і радыё атрымаў наступны дакумент:

«ПАПЯРЭДЖАННЕ

Паважаны(ная) _____

У сувязі з пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 10 студзеня 1992 года аб ліквідацыі Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па тэлебачанні і радыёвяшчанні і ў адпаведнасці з п. 2 загада Міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь ад 27.05.92 № 177 Вы папярэджваецеся аб маючым адбыцца вызваленні і скасаванні працоўнага дагавора з Дзяржтэлерадыё Рэспублікі Беларусь.

У тым выпадку, калі не адбудзецца Ваша працаўладкаванне ў створанай у сістэме Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі, то па заканчэнні двухмесячнага тэрміну з дня папярэджання Вы будзеце звольнены паводле пункта 1 артыкула 33 КЗаП Беларусі з прадастаўленнем ільгот і кампенсацый, якія прадугледжаны артыкулам 40з Кодэкса законаў аб працы Беларусі.

Уручана _____ »
(дата)

На з'яўленне папярэджанняў калектыў адрэагаваў агульным сходам, які прайшоў 3 чэрвеня і дзе аднагалосна было прынята пісьмо да С. Шушкевіча, В. Кебіча і міністра інфармацыі А. Бутэвіча.

Што ж выклікала пратэст тэле- і радыёжурналістаў, рэжысёраў, аператараў? З гэтым пытаннем карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да старшыні прафсаюзнага камітэта Беларускага тэлебачання і радыё Георгія МОЛЧАНА.

— У першую чаргу—гэтыя папярэджанні (дарэчы, на абласных тэлерадыёкамітэтах у папярэджаннях нават не было слоў «аб маючым адбыцца». Проста — «аб вызваленні»). Уявіце сабе, што значыць для чалавека, які прапрацаваў у гэтай сістэме дзесяць, дваццаць і больш гадоў, атрымаць такую паперку, прыйсці з ёю дадому...

І чаму менавіта ліквідацыя? Можна зразумець, калі ліквідуецца нейкае прадпрыемства, арганізацыя, але — тэлебачанне? Гэта ж няспынны творчы працэс, тое, без чаго ўжо нельга ўявіць нармальнага жыцця грамадства! За сваю гісторыю Дзяржтэлерадыё перажыло самае меншае чатыры рэарганізацыі — ад Мінскай студыі да Дзяржкамітэта, але ніколі не заходзіла гаворкі аб ліквідацыі. Ліквідацыя —самая апошняя, надзвычай жорсткая мера. Але — няхай. Толькі няўжо нельга было ўсё зрабіць па-людску, больш тактоўна, не псуючы нікому нервы?

Людзей трымаюць у няведанні. Створана ліквідацыйная камісія, якую ўзначальвае старшыня былога Дзяржтэлерадыё, і ў яе састаў ўваходзяць толькі нашы калегі. Атрымліваецца нейкая самаліквідацыя. Папярэдне нічога не высветлена ні са структурай будучай кампаніі, ні з яе кіраўніцтвам.

Чаму нельга было сумясціць працэсы ліквідацыі камітэта і стварэння кампаніі, каб людзі ведалі, хто і на якіх умовах будзе прымаць іх зноў на працу? На ліквідацыю дадзена два месяцы, а што потым?

Канешне, я далёкі ад думкі, што нехта хоча «разагнаць» тэлебачанне і радыё (гэта абсурд!), я веру, што і Вярхоўны Савет, Савет Міністраў і міністр інфармацыі кіраваліся самымі лепшымі памкненнямі. Але лічу, што спосабы дасягнення сваіх мэтаў яны абралі не самыя лепшыя. І, ведаючы неразваротлівасць нашай бюракратыі, схільнасць да блытаніны, можна зараз чакаць любых няўвязак.

— Георгій Васільевіч, але ж папярэджанні атрымалі толькі творчыя супрацоўнікі, а тэхнічныя проста пераводзяцца ў штат кампаніі. Ці не азначае гэта, што нехта мае намер «прасеяць» журналістаў праз нейкае сіта? Скажам, той ці іншы колісь востра пакрытыкаваў урад...

— Не думаю, што некаму гэта пагражае. Справа апрача ўсяго і ў тым, што тут працуюць спецыялісты, якіх няма кім замяніць. А аб'ём вяшчання будзе пашырацца — гэта непазбежна пры стварэнні сапраўды самастойнага нацыянальнага тэлебачання і радыё.

Пазбавіцца ж ад работніка, калі ён лайдак ці няздольны выконваць свае абавязкі, можна іншымі спосабамі. Ёсць атэстацыя, ёсць конкурсы на замяшчэнне пэўных пасад. Так што, калі ліквідацыя і адбываецца, то не для таго, каб звольніць каго з карэспандэнтаў.

— А калі раптам нехта ў выніку гэтых працэсаў усё ж пацерпіць?

— Лічу, што першай справай прафсаюзнага камітэта будзе дапамога тым, хто не трапіць у штат кампаніі. Але дрэнна тое, што мы не былі папярэджаны за тры месяцы, як таго патрабуе артыкул 8 новага Закона аб прафсаюзах Рэспублікі Беларусь, і з намі не вяліся перагаворы. І гэта яшчэ адна прычына, чаму мы хочам яснасці зараз, а не праз два месяцы — каб паспець прыняць належныя меры па абароне правоў нашых супрацоўнікаў. Мы нясём адказнасць за людзей, і пра гэта не трэба забываць.

Але я веру, што ўсё будзе добра. Упэўнены: ніхто дрэнага Беларускаму тэлебачанню і радыё не жадае.

Пасля гутаркі з Г. Молчанам я звярнуўся да намесніка міністра інфармацыі РБ Івана КАРЭНДЫ.

— Іван Арсеньевіч, ці ёсць, на ваш погляд, у гэтай сітуацыі для калектыву тэлебачання і радыё падставы пратэставаць?

— З юрыдычнага пункту погляду — ніякіх. Усе нашы дакументы добра прапрацаваны, і супярэчнасцей з законамі там няма. Іншая справа, што чыста па-чалавечы супрацоўнікаў тэлебачання і радыё можна зразумець. У любым калектыве такая падзея, як ліквідацыя, выклікае напружанасць і хваляванне.

Але не трэба думаць, быццам лёс тэлебачання і радыё вырашаюць урад і Міністэрства інфармацыі, што ўсё робіцца па нейкаму дыктату. Зусім не — гэта найперш унутраны працэс. І ініцыятыва кіраўніцтва Дзяржтэлерадыё аб стварэнні Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі была яшчэ да студзеньскай пастановы Вярхоўнага Савета. Рэарганізацыя гэтых структур даўно наспела, ідзе аб'ектыўны працэс, які адпавядае агульнанацыянальным інтарэсам.

— Чаму, калі не сакрэт, нельга было сумясціць ліквідацыю са стварэннем кампаніі, каб усё ішло адначасова?

— Ёсць пэўныя цяжкасці арганізацыйнага плана. Але хутка ўсё прыйдзе ў норму.

— А як растлумачыць, што звальненню падлягаюць толькі творчыя супрацоўнікі?

— Звальненне ў сувязі з ліквідацыяй Дзяржтэлерадыё распаўсюджваецца на ўсіх. Але тэхнічныя і гаспадарчыя службы будуць, у асноўным, пакінуты ў сваім цяперашнім выглядзе, а творчыя падраздзяленні сфарміруюцца згодна з новай канцэпцыяй тэлебачання і радыё. Іх, практычна, трэба ствараць нанава.

Але абсалютная большасць творчых супрацоўнікаў гэтыя рэарганізацыі нічым не пагражаюць. Калі чалавек сапраўды прафесіянал, калі ён можа і хоча працаваць, няхай не сумняваецца — сваё месца ў тэлерадыёкампаніі ён зойме.

Гутарыў Аляксандр БЯРСУДСКІ.

МАРАФОН СКОНЧЫЎСЯ: НЯХАЙ ЦЕШАЦЦА ДУШЫ

Месяц як скончыўся тэлемарафон «Выратуем дзяцей». Мінуў час, падзея, якая закранула сэрцы грамадзян нашай рэспублікі, стала паціху забывацца. Але вынікі тэлемарафона, калі ацэньваць яго з пункту погляду паступлення сродкаў ад арганізацый, устаноў, працоўных калектываў і проста ад людзей на рахункі дзіцячых фондаў, у дзіцячыя інтэрнаты, абнадзейваюць.

Дзякуй Богу, акцыя, патрэбнасць якой дыктавалася становішчам тых няшчасных беларускіх дзяцей, для якіх трэба выпрошваць грошы на харчаванне, лекі, адзенне, магчыма, на нейкі час зможа забяспечыць выхаванне і лячэнне нашых нашчадкаў. Але галоўнае, зноў паўторымся, заключаецца ў іншым — людзі адгукнуліся на марафон, адчулі боль сэрцаў многіх маленькіх беларусаў...

На прэс-канферэнцыі, якую наладзіў Беларускі дзіцячы фонд, былі падведзены вынікі тэлемарафона.

— На рахунак дзіцячага фонду 1.500.000 рублёў, камерцыйны банк «Беларусь» — 1.000.000, Асацыяцыя незалежных прафсаюзаў — 60.000, савет Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі — 50.000, «Мінскбізнесбанк» — 200.000, асуджаныя з горада Оршы — 5.305, Магілёўскі аблвыканком — 100.000.

Уладзімір Ліпскі ў канцы сваёй справаздачы заявіў, што цяпер такія акцыі стануць традыцыйнымі.

Што зробіш, пакуль што, на жаль, нармальнае і шчаслівае дзяцінства без ахвяраванняў немагчымае.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ●

«НЯМЕЦКАЯ ХВАЛЯ»

● Прэзідэнт ЗША Джордж Буш у час сустрэчы з прэзідэнтам Расіі Барысам Ельцыным заявіў, што гэта — пачатак новай эры. «Гэта сустрэча, — падкрэсліў ён, — не з'яўляецца сустрэчай дзвюх дзяржаў, якія змагаюцца за сусветнае панаванне, а сустрэча двух партнёраў, якія імкнуцца да стварэння дэмакратычнага свету». Ельцын у сваю чаргу зазначыў, што Расія не просіць ЗША вырашаць за яе свае праблемы, а ён мае намер адносін уласныя ідэі і прапановы.

● Як паведамляюць, баі ў раёне Нагорнага Карабаха ў цэлым сціхлі. Афіцыяльныя армянскія прадстаўнікі сцвярджаюць, што іх сілы стрымалі наступленне азербайджанцаў з мэтай адбіць тэрыторыі, захопленыя некалькі дзён назад армянамі.

● Францыя беззваротна прадаставіла Украіне 1 мільён долараў для заснавання ў Кіеве фондавай біржы.

«БІ-БІ-СІ»

● Прэзідэнт Украіны Леанід Краўчук, які знаходзіўся з двухдзённым візітам у Францыі, падпісаў Парыжскую хартыю, што афіцыяльна замацоўвае за Украінай статус удзельніка Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. Краўчук і прэзідэнт Францыі Франсуа Мітэран падпісалі таксама дагавор аб узаемным супрацоўніцтве. Па ўмовах гэтага дагавора Францыя абяцае Украіне эканамічную дапамогу і падтрымлівае жаданне Украіны стаць паўнапраўнай еўрапейскай дзяржавай. У сваю чаргу Украіна абавязваецца адмовіцца ад усёй ядзернай зброі на сваёй тэрыторыі.

● Пасол Расіі ў Індыі Анатоль Друкаў заявіў, што Расія прапанавала Індыі пабудаваць сумеснае прадпрыемства па вытворчасці танкаў, самалётаў і іншага ваеннага абсталявання. Індыя ўжо мае рускую зброю, якую атрымліваецца па ліцэнзіях былога Саюза ССР. Цяпер у Індыі будзе вырабляцца гэта зброя як для самой краіны, так і на экспарт.

● Новы прэзідэнт Азербайджана Эльчыбей прыняў афіцыяльную прысягу. Ён паабяцаў падтрымліваць адзінства і суверэнітэт рэспублікі. У час прынясця прысягі Эльчыбей выкарыстаў каран і азербайджанскую канстытуцыю. Ён заклікаў да супрацоўніцтва з суседзямі Азербайджана — Турцыяй і Іранам, а таксама са Злучанымі Штатамі, Вялікабрытаніяй і іншымі краінамі.

● Былы міністр абароны Філіпін Фідэль Рамос, абраны на пост прэзідэнта краіны, праз пяць тыдняў пасля афіцыяльнага падліку галасоў, аб'яўлены кіраўніком Філіпін. У канцы месяца ён заменіць на гэтым пасту цяперашняга прэзідэнта Карасон Акіна.

● Іран і Грузія падпісалі шэраг пагадненняў аб супрацоўніцтве ў такіх галінах, як сувязь, транспарт і гандаль.

РАДЫЁ «СВАБОДА»

● У час сустрэчы ў Белым доме прэзідэнты ЗША і Расіі Джордж Буш і Барыс Ельцын дамовіліся аб правядзенні сумесных расследаванняў лёсаў ваеннапалонных і прапаўшых без звестак амерыканцаў у гады другой сусветнай вайны, а таксама войнаў у Карэі і В'етнаме. Назіралнікі адзначаюць, што ад вырашэння гэтага пытання будзе многае залежаць у далейшым амерыкана-расійскіх адносінах. Ельцын звярнуўся да Буша з просьбай дапамагчы ўзняць са дна Балтыйскага мора кантэйнеры з хімічнай зброяй, якія былі патоплены Германіяй у канцы другой сусветнай вайны. Па словах прадстаўніка расійскага прэзідэнта Косцікава, кантэйнеры праржавелі, і калі іх не ўзняць у бліжэйшы час, у рэгіёне можа адбыцца экалагічная катастрофа.

● У адпаведнасці з заявай Арменіі, яна можа адмовіцца ад удзелу ў мірных перамовах па Нагорнаму Карабаху, калі не будзе дасягнута дамоўленасці аб перамір'і на пасяджэнні міністраў адзінаццаці краін у Рыме. Гэтыя перамовы, што праходзяць пад эгідай Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, маюць мэтай пакласці канец узброеным сутыкненням паміж арменамі і азербайджанцамі. Яны праводзяцца ў парадку падрыхтоўкі да канферэнцыі па Нагорнаму Карабаху ў Мінску, якая адбудзецца на наступным тыдні.

● Міратворчыя сілы ААН чакаюць дазволу на ўстанаўленне кантролю над аэрапортам Сараева. Гэта дазволіць адкрыць аэрапорт для прыняцця грузаў гуманітарнай дапамогі, у якой маюць вострую патрэбу прыкладна 300 тысяч чалавек, блакіраваных у Сараеве.

● Прэм'ер-міністр Польшчы Паўляк указаў на складанасці, звязаныя з фарміраваннем новага кабінета. Па словах Паўляка ў ходзе ўчарашняй сустрэчы прадстаўнікам партый, якія, магчыма, складуць будучую ўрадавую кааліцыю, удалося вырашыць асобныя рознагалоссі, аднак партыі, якія прымаюць удзел у перамовах, не маюць большасці ў парламенце. У сувязі з гэтым Паўляк вымушаны дабівацца падтрымкі хрысціянскага нацыянальнага саюза, які ўзначальвае Якубоўскі. Але той заявіў, што супрацоўніцтва хрысціянскай партыі Паўляка з камуністамі ў перыяд да 1989 года робіць непрымальнай фігуру Паўляка на пасадзе лідэра цяперашняга польскага ўрада.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ●

БАР'ЕР ДЛЯ «КАРЫДЫ КАХАННЯ»

МІНСК. Спецыяльная камісія пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь рэкамендавала часова прыпыніць пракат копіі сусветна вядомага японскага фільма «Імперыя пачуццяў» («Карыда кахання») з-за наяўнасці ў ім значнай колькасці «парнаграфічна-натуралістычных» сцэн.

Праўда, тое, што ў Мінкультуры лічаць парнаграфіяй, многія кіназнаўцы-спецыялісты называюць шэдэўрам сусветнага эратычнага кінематографа. Усё роўна вырашана, што кінастужка можа дэманстравацца толькі асобам, старэйшым за 18 гадоў, прычым у спецыяльна адведзеным кінатэатры з каментарыем кіназнаўцы. Аднак, па-першае, такога кінатэатра ў Мінску пакуль што няма і ў бліжэйшы час наўрад ці будзе, бо ніхто не захоча запэцкаць сваю рэпутацыю паказам толькі забароненых для шырокага пракату стужак, ды і кантынгент гледачоў там будзе адпаведны. А, па-другое, тыя, хто раней глядзеў «Імперыю пачуццяў» у відэаварыянце, сцвярджаюць, што кінаварыянт значна скарочаны. Прычым усе эратычныя сцэны захаваны, а вось сюжэт стужкі парушаны. Напэўна, нехта хацеў дагадзіць густам савецкіх гледачоў.

Тым не менш «Імперыя пачуццяў» з поспехам паспела прайсці на некалькіх клубных кінасеансах і выклікала пэўны грамадскі рэзананс, таму яе «часовае» прыпыненне сустрэта насцярожана. Бо народная мудрасць сцвярджае, што няма нічога больш пастаяннага, чым менавіта «часовае».

«КАЙФ» АД СУСЕДА

На Беларусі зарэгістравана два выпадкі віч-інфекцыі сярод наркаманаў.

Гэта вельмі насцярожыла медыкаў. Наркотыкі ўжываліся нашымі людзьмі за межамі краіны — у Польшчы. Спецыялісты сцвярджаюць, што суседства гэтай краіны можа адыграць ракавую ролю: менавіта там нашым людзям становіцца даступна многае і за адносна нізкі кошт. У суседняй дзяржаве некаторыя нашы суайчыннікі ўпершыню злавілі наркатычны «кайф». Трэба зазначыць, што ў Польшчы асноўны шлях перадачы віруса СНІДу — менавіта ўнутрывеннае ўвядзенне наркотыкаў.

Дажартавацца можна гадоў гэтак на пяць

Падобна, што жартаўнікоў у нас становіцца ўсё больш. Але своеасаблівыя жартачкі, адразу трэба сказаць, ні ўсмешкі, ні добрага настрою не выклікаюць.

Два дні назад невядомы ў Гомелі падняў па трывозе на ногі УУС і райаддзелы ў чатыры гадзіны раніцы: «У восем гадзін будзе ўзарваны вакзал». На шчасце, ніякіх бомбаў там не было.

А 16 чэрвеня ў 15 гадзін у дзяжурную часць пазваніў з тэлефона-аўтамата яшчэ адзін «дабразычлівец», які паведаміў, што павінна бабахнуць на Мінскім камвольным камбінаце. З 16 гадзін да 17.30 з камбіната былі выведзены людзі і за справу ўзяліся сапёры. Як і ў папярэднім выпадку, ніякай міны не знайшлі.

Як паведаміў нам начальнік Ленінскага райаддзела міліцыі Мікалай Ільютчык, запіс размовы з жартаўніком захаваўся. Цяпер справа за малым — трэба адшукаць таго свавольніка. Практычна заўсёды зрабіць гэта ўдаецца.

А. ГЕРАСІМАЎ.

Па «Розгласу» дзяжурылі: А. СЛАНЕЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ, І. КАРНЕЙ, І. ШЧУЧЭНКА, С. СУЛКОЎСКІ. Тэл. 32-44-02, 32-43-03.

ПЫТАЛЬНІК

ПАМІЖ АХВОТАЙ І АБАВЯЗКАМ

«Мяне прымушаюць застрахаваць карову. Раскажыце, калі ласка, аб абавязковым і добраахвотным страхаванні для насельніцтва».

С. БУЛДАВЕЦКАЯ.
Мазырскі раён.

У сістэме дзяржаўнага страхавання абавязковае страхаванне для насельніцтва — гэта страхаванне ўласных жылых дамоў, надворных пабудоў, буйной рагатай жывёлы і коней. Існуе абавязковае страхаванне пасажыраў, ваеннаслужачых, супрацоўнікаў МУС і КДБ, медработнікаў ад СНІДа. У мінулым годзе на Беларусі ўведзена абавязковае страхаванне ваеннаслужачых. Удзельная вага абавязковых відаў у агульнай сістэме страхавання займае недзе 3—5 працэнтаў. Аднак і тут ёсць пэўныя цяжкасці.

Напрыклад, Мінаўтатранс і Беларуская чыгунка адмаўляюцца пералічваць Белдзяржстраху грошы за страхаванне, што ўтрымліваюцца з продажу кожнага білета на поезд ці аўтобус. Затое Аэрафлот пералічвае страхавыя ўзносы заўсёды спраўна. Калі вяртацца да ліста чытачкі, то, дарэчы, тую ж карову пры жаданні можна застрахаваць ажно на 17 тысяч рублёў.

«АРЛОЎ», «РАСПУЦІН» І ІНШЫЯ

«Напэўна, многія наведвальнікі камерцыйных крам звярнулі ўвагу на багацце імпартных гарэлак з рускімі назвамі: «Арлоў», «Распуцін», «Папоў» і г. д. Адно незразумела: дзе і хто іх выпускае?»

П. ПАПЛЯЛУШКА.
г. Слонім.

Так, вялікія бутэлькі з расфарбаванымі яркімі этыкеткамі па цане 500—1.000 рублёў і вышэй стаяць сёння ў любой камерцыйнай краме. Як вынікае з надпісаў, зроблены яны ў большасці сваёй у Германіі. За мяжой даўно ўжо вядомы некалькі марак «рускіх» гарэлак, такіх, як «Смірноф», «Гарбачоф», «Эрыстоф». Але ўказаныя ў пісьме чытача невядомы наогул. Невядомыя яны і самым кампетэнтным у гэтым пытанні ведамствам — фірме «Вінэкспарт» былога ВАА «Саюзплодімпарт» і Маскоўскаму інстытуту харчовых біятэхналогій. Спецыялісты гэтых устаноў паведамілі, што пастаўкі падобных псеўдарускіх псеўдагарэлак вядуцца з Германіі і Польшчы сумеснымі прадпрыемствамі і ніхто не прад'яўляў іх на экспертызу, таму там нічога не ведаюць аб іх якасці. Хутчэй за ўсё выпрацоўваюцца яны ва ўсходніх землях былой сацыялістычнай ГДР. Тэхналогія невядома. Што да нашай уласнай прадукцыі, то не выключана, што ў хуткім часе, — па прыкладу Расіі, — цана на «мясцовую» гарэлку будзе таксама адпушчана на свабоду. Плюс да ўсяго няцяжка спрагназіраваць, што ў сувязі з ростам цэн на збожжа цана на гарэлку вырасце ў любым выпадку.

ТАКІЯ НОРАВЫ...

«Кажуць, што за мяжой людзі могуць застрахаваць самыя патаемныя часткі цела. Ці ёсць у рэдакцыі якія-небудзь звесткі аб такіх выпадках?»

ВАЛЯНЦІН Р., ВІКТАР Б.
г. Мінск.

Трэба сказаць, што ў краінах Захаду далёка не кожнаму страхавыя кампаніі застрахуюць тыя часткі цела, якія мы звычайна хаваем ад чужых вачэй. Гэта робіцца толькі тым, у каго прафесія звязана з гэтымі чалавечымі органамі. Вось некалькі апошніх фактаў з дасье «Звязды». Так, «філейная» частка англійскай манекеншчыцы Сюзанны Мізі, якой яна рэкламуе ніжнюю бялізну, застрахавана ў кампаніі Лойда на 1 мільён франкаў. Таму дагавор забараняе Сюзанне нараджаць і займацца небяспечнымі відамі спорту: гуляць у футбол, лятаць на дэльтаплане, прыгаць з парашута...

«А я ўжо падвяргаюся жудаснай рызыцы» — скардзіцца адзін стрыптызёр, шоу якога ўключае «смяротны нумар»: жанчына з публікі зубамі распранае яго бандаж. Страхавая кампанія, куды звярнуўся «артыст», палічыла яго работу сапраўды небяспечнай і застрахавала яго «мужчынскую вартасць» ажно на 10 мільёнаў франкаў.

КУВАЛА ЗЯЗЮЛЯ ГАДЫ СВАЙМУ СЫНУ...

Дзяўчына як дзяўчына. Сустрэла б дзе-небудзь на вуліцы — пэўна, не звярнула б на яе ніякай увагі. На твары ж нічога не напісана... Мне здавалася, што яна адмовіцца са мной размаўляць. Але не — я і пяці хвілін не чакала ў бальнічным калідоры, пакуль медсястра пайшла за ёю ў палату. Размова не заладзілася з самага пачатку. Ды, бадай, і не магло быць інакш — Лена адмаўляецца ад свайго дзіцяці. Ужо другога. Першага свайго хлопчыка яна таксама пакінула ў раддоме дзесьці каля года назад...

— Так будзе лепш і для мяне, і для яго, — Лена не здавалася ні збянтэжанай, ні засмучанай. — Я сама не ведаю яшчэ, як жыць буду. Грошай у мяне няма, жытла прыстойнага таксама. Усе кажуць, што я бессардэчная, бессаромная! А я ведаю, што раблю. Не змагу я выхаваць яго так, як трэба. Таму няхай ён лепш нічога пра мяне не ведае.

Лене 22 гады. Ні мужа, ні бацькоў у яе няма. Сама выхоўвалася ў дзіцячым доме. Затым працавала неяк у адной з мінскіх сталовак, потым яшчэ дзесьці. Зараз — беспрацоўная. На што жыве? Што Бог пашле. Хто бацька дзіцяці, дакладна не ведае. Ведае, што завуць Сашам. Пазнаёміліся на вечарыне ў сяброў, а раніцай ён знік, не пакінуўшы ні тэлефона, ні адраса. Такая вось «гісторыя кахання»...

— Чаму ты вырашыла нараджаць, калі ведала, што адмовішся ад дзіцяці?

— Нічога я не ведала. Спачатку вельмі хацела дзіця. Думала, потым штосьці зменіцца. Знайду добрую работу ці яшчэ што...

Але нічога не змянілася. Зрэшты, як не змянілася і год назад. Першага свайго сына яна таксама «вельмі хацела». А да канца цяжарнасці канчаткова вырашыла, што будзе лепш ад яго адмовіцца. Дарэчы, яго яна нараджала ў іншым раддоме.

— І табе не хацелася...

— Ой, толькі не трэба мяне выхоўваць! Я ж вам жыць не перашкаджаю...

За апошнія гады колькасць немаўлят, пакінутых сваімі маці «на волю лёсу», павялічылася па Мінску прыкладна на трэць. Безумоўна, дзіця сёння — вялікая раскоша. Дастаткова падлічыць толькі кошт таго, што патрэбна яму на першым годзе жыцця. А дзіцячае харчаванне, розныя неабходныя дробязі, якіх у продажы, як кажуць, «днём з агнём»...

— Таму і пакідаюць нованароджаных у нас. І калі раней многіх дзяўчат удавалася пераканаць забраць дзіцятка, то зараз ніякія размовы не дапамагаюць, — кажа Галіна Уладзіміраўна Кірылава, загадчыца аддзялення для нованароджаных Мінскай абласной бальніцы. — Прычыны называюць усялякія: ці то няма грошай, ці то жытла, ці то бацька строгі... Гадоў такім дзяўчатам звычайна па 15—20, выглядаюць яны, праўда, значна сталейшымі, часта нідзе не вучацца, не працуюць. П'юць, кураць — гэта ў любой жанчыны па твары бачна адразу. Трымаюцца даволі ўпэўнена, нават нахабна. Размаўляць з імі вельмі цяжка і непрыемна — адмаўляюцца рашуча, нават не плачуць ніколі. Праўда, зусім нядаўна выпісаліся дзве студэнткі — таксама не хацелі забіраць немаўлятак. Але потым передумалі...

— І куды трапляюць дзеці, ад якіх адмовіліся?

— Большасць з іх усынаўляюць або ўдачараюць жанчыны, якія лечацца ў нас ад бясплоднасці. Існуе вялізная чарга на ўсынаўленне ў гарвыканкоме, бацькі могуць чакаць гадамі... Вядома, мы патрабуем даведкі аб матэрыяльнай забяспечанасці сям'і, мама абавязкова павінна быць замужам, ды і згода будучага бацькі — таксама справа немалаважная. Астатнія дзеці накіроўваюцца па месцы жыхарства мам — у дамы немаўляці, якія існуюць у кожным раёне. Вялікая колькасць нованароджаных — на лячэнні ў бальніцы. Бывае, не паспеем афарміць патрэбныя дакументы, як дзіця забіраюць у бальніцу. Хваробы — звычайна неўралагічнага характару. Гэта і натуральна, калі маці курыць, п'е, бацька таксама, дзіця непажаданае з самага пачатку, жанчына ў стане пастаяннага стрэсу. А якіх толькі парад яна не наслухаецца, якіх сродкаў не перабярэ, каб пазбавіцца ад яго!

...І калі надыходзіць час нараджаць, дзяўчына прымае апошняе рашэнне — адмовіцца. У рэшце рэшт дзесьці яе можна зразумець — так не хочацца ў 15—16 гадоў ускладняць сабе жыццё бясконцымі пялюшкамі і неспакойнымі начамі. Ды і бацька з маці асаблівай пяшчоты да будучага ўнука не адчуваюць. А там глядзіш — і на ўсё жыццё адна застанешся, каму з дзіцем патрэбна! І калі на такія гады гэтыя прычыны здаюцца дастаткова пераканаўчымі, цяжка зразумець бездапаможнасць і разгубленасць жанчын больш сталага ўзросту. Была вось адна — нарадзіла пяцёра дзяцей, а шостага вырашыла пакінуць дзяржаве. Маўляў, адзінокая, і сродкаў на выхаванне няма.

— Дык навошта наогул было яго нараджаць! — абураецца Галіна Уладзіміраўна. — Не дзяўчынка ж. Мая б воля — я б кожную такую маці прымусіла плаціць дзяржаве пэўную суму грошай. А так у нас усё вельмі проста: нарадзіла — адмовілася і гуляй сабе вольнай птушкай. Павінна, нарэшце, нейкая адказнасць за свае ўчынкі быць! Мая маці выхавала чатырох сірот, зусім чужых для яе дзяцей.

— І вельмі цяжка пераканаць жанчыну не рабіць апошні крок?

— Часта проста немагчыма. Бывае, паразмаўляеш з такой — усе нервы ўзвінціш. Кажу, гэта ж ваша дзіця, потым вы сябе ўсё жыццё дакараць будзеце, што разлучыліся з ім. А яна — не і не. Вельмі часта, асабліва калі дзяўчына непаўналетняя, выклікаем яе маці, спрабуем пагаварыць з ёй. А маці: ды вы што! Прывязём дзіця — гэта ж сорам на ўсю вёску! А як дачка цяжарнай хадзіла, хіба суседзі не бачылі? Не, кажа, апошнія месяцы хавалі яе ў сваякоў, ды і сюды прыехалі, каб дома «не свяціцца». — А вы ведаеце, што сорам — якраз тое, што вы робіце, а калі возьмеце дзіця, вас, наадварот, паважаць будуць. Людзі ў нас не такія і злосныя — пагамоняць з тыдзень, на тым і супакояцца... Тут мне яшчэ аргумент — айчым не дазваляе. Дык прабач, мілая, калі табе чужы мужык даражэй за родную ўнучку, за ўласную дачку, якую ты, менавіта ты пазбаўляеш сваёй увагі!...

А то яшчэ адна сям'я. Дачка нечакана нарадзіла, а яны ў Ізраіль сабраліся. Навошта ж лішні цяжар?.. Як бачыце, прычыны розныя, але ні адна, лічу, не можа быць дастаткова важкай.

...А тым часам у кожным мінскім радзільным доме штомесяц дзве-тры-чатыры маці назаўсёды адмаўляюцца ад сваіх дзяцей.

Ірына ЗАВАДСКАЯ.

БЕЛАРУСКАЯ НАВУКОВА-ПРАМЫСЛОВАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ

БЕЛФАКС

белфакс

ДА ВЕДАМА ПАЛІГРАФІЧНЫХ І ВЫДАВЕЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ!

ПРАМЫСЛОВА-КАМЕРЦЫЙНАЙ КАМПАНІЯЙ «БЕЛФАКС»

атрыманы эксклюзіўныя правы на выданне кнігі Аляксандры Рыплей «СКАРЛЕТ»

(працяг «Знесеных ветрам», на рускай мове).

Нагадваем пра адказнасць за «падпольны» выпуск твору.

Двухтомнік «СКАРЛЕТ»

выйдзе ў свет у бліжэйшы час

КНІГАГАНДЛЮЮЧЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ МОГУЦЬ ЗВЯРТАЦЦА З ЗАЯЎКАМІ

ПА ТЭЛ. У МІНСКУ:

32-38-92, 32-14-55, 32-31-21.

ФАКС 32-82-22.

РАСЛІНЫ І ЗДАРОЎЕ

ЗЕЛЬНІК

Дуб звычайны

На Беларусі распаўсюджаны ў ліставых лясах. У пойменных дубровах утвараюцца суцэльныя зараснікі дубу. Жыве да 400—500 гадоў, часам да 1.000—1.500 гадоў.

Дрэва вышынёй да 40—50 м, ствол магутны, галіны звілістыя, каржакаватыя, крона густая, шырокая. Кара маладых галінаў гладкая, аднагадовых — чырвона-бурая, старых парасткаў — цёмна-шэрая, растрэсканая.

Лісце да 15 см даўжыні і 10 см шырыні, шчыльнае, бліскотнае. Пад восень на лістах бываюць нарасці — арэшкі-галы, уздуцці ад укусаў насякомага — арэхатворкі, якая адкладвае пад скуру ліста свае яйкі.

Цвіце ў красавіку-маі. Кветкі раздзельнаполыя, аднадомныя, малапрыкметныя, мужчынскія ствараюць павіслыя доўгія сярожкі, у жаночых 1—3 падоўжаныя кветаножкі. Цвіце на адкрытых месцах у 10-гадовым, у лесе — 40—60-гадовым узросце.

Плады — прадаўгаватыя жалуды, карычневыя, бліскотныя, размяшчаюцца ў плюсцы — неглыбокай круглай чашачцы, гаркаватага смаку, бываюць і салодкія. Паспяваюць у верасні — кастрычніку.

У кары дуба ўтрымліваюцца дубільныя, бялковыя рэчывы, арганічныя кіслоты (галовая, элагавая і інш.), катэхіны, кверцэцін, цукар, вугляводы, слізь, крухмал, пекціны і інш. У жалудах — крухмал, дубільныя рэчывы, кверцэцін. Чым старэйшае дрэва, тым менш дубільных рэчываў у яго кары.

ГАСПАДАРЧАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ

У ГАСПАДАРЦЫ выкарыстоўваюць драўніну дуба, якая вызначаецца трываласцю, цвёрдасцю, доўгім жыццём. З яе робяць мэблю, паркет, бочкі, фанеру, ручкі, кухонныя дошкі, іншыя трывалыя вырабы, устойлівыя да вільгаці.

Драўніну дуба шырока выкарыстоўваюць у судна- і вагонабудаванні, машынабудаванні, гідратэхнічных збудаваннях.

Кара дуба прымяняецца для дублення скураў. З яе робяць коркі, чорныя фарбавальнікі, чарніла.

СТРАВЫ З ЖАЛУДАМІ

ДЛЯ ХАРЧАВАННЯ выкарыстоўваюць жалуды. З іх са старажытных часоў рабілі муку, крупы. Муку дабаўляюць для смаку і пажыўнасці ў хлеб, аладкі, бліны, арэхавыя тарты, каву. Падсмажаныя жалуды добра да чаю замест сухароў, замяняюць арэхі ў кандытарскіх вырабах.

МУКА З ЖАЛУДОЎ. Жалуды разрэзаць, папярэдне ачысціць ад шкарлупіны, заліць на двое сутак вадой (мяняць яе 3-4 разы ў дзень). Затым ваду зліць, перакласці жалуды ў паліваны посуд, заліць вадой у суадносінах 1:2 і нагрэць да кіпення. Мокрыя і цёплыя жалуды прапусціць праз мясарубку, раскласці тонкім слоем на фанеры і сушыць на паветры, у печцы ці духоўцы. Можна кавалачкі жалудоў высушыць, а пасля патаўчы ў ступе ці змалоць у кавамолцы.

КРУПЫ. Жалуды разрэзаць, высушыць і здрабніць на крупы.

Высушаныя жалуды захоўваюцца доўгі час, не трацяць пажыўных уласцівасцей.

АЛАДКІ. Жалудовую, пшанічную ці ячменную муку развесці кіслым малаком, пасаліць, дадаць цукар, сырое яйка, соду, соль, старанна размяшаць. З масы смажыць на масле аладкі. Перад падачай на стол паліць смятанай ці растопленым маслам.

100 г мукі з жалудоў, 200 г мукі пшанічнай (або ячменнай), 250 мл кефіру, 1 яйка, 1 чайная лыжка цукру, 1/2 чайнай лыжкі соды, 100 г алею, соль па смаку.

ХЛЕБ З ЖАЛУДОВАЙ МУКОЙ. Жалудовую муку змяшаць з пшанічнай ці ячменнай, дадаць разведзеныя ў малацэ ці вадзе дрожджы, размякчаны маргарын, соль, цукар, замясіць цеста і паставіць у цёплае месца. Калі цеста падыдзе, фармаваць хлеб і выпякаць у духоўцы.

800 г мукі з жалудоў, 100 г мукі пшанічнай (ці ячменнай), 25 г дрожджэй, 500 мл малака (ці вады), 50 г маргарыну, 1 ст. лыжка цукру, 1 чайная лыжка солі.

КАВА. Падсмажаныя жалуды, жыта, ячмень, авёс, пшаніцу змяшаць, дадаць высушаныя карані дзьмухаўца, дзікага цыкорыю і змалоць у кавамолцы. Захоўваць у закрытым шкляным посудзе.

1 чайную лыжку сумесі заварыць 250 мл кіпеню, настояць і піць як чай. Гарачае малако, цукар ці мёд дадаваць па смаку.

30 г жалудоў, 20 г ячменю, 10 г жыта, 10 г аўса, 20 г цыкорыю, 10 г дзьмухаўца, 15 г пшаніцы.

ЛЕКАВЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ

У НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЕ выкарыстоўваюць кару дуба, жалуды. Кара аказвае вяжучае, процізапаленчае, раназагойвальнае, мачагоннае дзеянне, зніжае крывяны ціск, павышае эластычнасць і трываласць сценак крывяносных сасудаў.

НАСТОЙ КАРЫ ДУБА. 10 г кары дуба настойваюць у 400 мл астуджанай гатаванай вады 6 гадзін, пасля працадзіць. Піць па 100 мл 3—4 разы на дзень перад ядой пры захворваннях страўніка, кішэчніка, нырак, лёгкіх.

АДВАР З КАРЫ ДУБА. 20 г кары здробненай варыць у 200 мл вады 30 хвілін. Піць па 100 мл 3 разы ў дзень пры калітах з паносамі, страўнікава-кішэчных крывацёках, гастрытах, паласкаць рот, горла пры ангінах, стаматытах. Старайцеся не браць кару з жывых дрэваў, іх нельга нішчыць.

40 г кары варыць у 250 мл вады 30 хвілін, пасля настойваць 2 гадзіны. Рабіць прымочкі пры апёках, экземе; клізмы, ванначкі пры крыватачывым гемароі; прамываць раны, болькі, рабіць ванны для ног пры іх патлівасці.

МАЗЬ З КАРЫ ДУБА. Дзве часткі парашку кары дуба, адну частку пупышак чорнай таполі змяшаць з сямю часткамі масла, вытрымаць у цёплай печы 12 гадзін, затым варыць на слабым агні ці на вадзяной бані 30 хвілін, працадзіць. Маззю змазваць апёкі, абмаражэнні.

ЖАЛУДЫ. Высушаныя, ачышчаныя ад абалонак зерні падсмажыць да ружовага колеру. Выкарыстоўваць пры паносах.

КАВА З ЖАЛУДОЎ. Падсмажаныя жалуды здрабніць у парашок і заварваць як каву. Даваць дзецям пры залатусе.

Паветра ў дубовых гаях напоўнена фітанцыдамі дубу, што спрыяе паляпшэнню агульнага самаадчування, суцішае сардэчныя і галаўныя болі, паляпшае сон.

Парашком з высушаных галаў ці свежымі галамі змазваюць экземы, лішаі, апёкі.

Кара дуба ўваходзіць у састаў збораў для ваннаў ад залатухі і рахіту.

Процівапаказанні не ўстаноўлены.

НАРЫХТОЎКА

НАРЫХТОЎКА КАРЫ ДУБА І ЖАЛУДОЎ. Здымаць кару можна толькі з дазволу лясніцтва на лесасеках з дрэваў, прызначаных для высечкі ці ссечаных пры санітарнай ачыстцы, а таксама з парасткаў, што засталіся ля пнёў спілаваных дрэваў. Трэба памятаць, паўторымся, што выдаленне маладой кары навят на невялікім участку можа прывесці да гібелі дрэва.

Час збору павінен супадаць з перыядам сокаруху, з красавіка па чэрвень. На маладой кары, гладкай, непашкоджанай, без трэшчын і нарасцяў, робяць кальцавыя надрэзы на адлегласці 30 см адзін ад аднаго, затым разразаюць уздоўж і здымаюць кару ў выглядзе жалабкоў.

Кару раскладваюць тонкім рыхлым слоем на падсціле, фанеры і сушаць у памяшканні, якое добра праветрываецца, пад павецню, на гарышчах, штодзённа пераварочваючы. Дасушваюць у сушылках, печах, духоўках пры тэмпературы не вышэй 40—50°С.

Пры сушцы трэба сачыць, каб кара не запылілася, не забрудзілася, не намокла (пры намаканні яна траціць дубільныя рэчывы, да выкарыстання робіцца непрыгоднай).

Высушаная сыравіна — кавалкі кары даўжынёй 20—30 см, звонку бліскотныя, часам матавыя, светла-бурыя ці шэрыя, гладкія ці злёгку маршчынаватыя, без трэшчын. З унутранага боку жаўтавата- ці чырванавата-бурыя, з падоўжнымі рэбрычкамі. Пры сушцы пах кары знікае, пры размочванні ў гарачай вадзе спецыфічны пах аднаўляецца. Смак спачатку саладкаваты, пасля — даўка-горкі.

Жалуды атрасаюць з галін паспелымі, калі яны лёгка выпадаюць з чашачкі, пасля першых замаразкаў, адразу ачышчаюць ад плюсак, таму што пад імі ўтвараецца плесня, раскладваюць тонкім слоем і сушаць спачатку на паветры, потым дасушваюць у сушылках, печах, духоўках пры тэмпературы не вышэй 40—50°С. Пасля сушкі выдаляюць каляплоднікі, шкарлупіну і смажаць да ружовага колеру.

Гатовая сыравіна — светла- ці цёмна-бурыя семядолі, без паху, спачатку саладкаватага, затым гаркавата-даўкага смаку.

Захоўваюць кару і жалуды ў сухім памяшканні, якое добра праветрываецца.

Тэрмін захоўвання кары да 5 гадоў, жалудоў — 3 гады.

Ніна АЛЯКСЕЙЧЫК, Валер САНЬКО.

Імя ёй — «Творчасць»

У гэтай прасторнай зале каліс ці мінчанам прапанавалі хлеб надзённы. Сёння — хлеб духоўны: замест каўбас на сценах вісяць пейзажы і партрэты, а замест пірагоў — шырокі выбар керамічных, шкляных, драўляных сувеніраў. На ўваходзе ў былую кулінарыю прымацавана стракатая шыльда «Галерэя Гал-Творчасць».

— Наша наваселле ў гэтай зале не выпадковае, — тлумачыць віцэ-дырэктар галерэі мастак Канстанцін Шаранговіч. — У грамадстве даўно наспела патрэбнасць бачыць экспазіцыі, не абмежаваныя чыімсьці асабістым густам. У нашу галерэю аўтары прапануюць творы розных школ і напрамкаў. Свабода прапановы і свабода пакупкі — вось дэвіз новай галерэі. Любую выстаўленую работу можна тут жа набыць за любую валюту, а таксама па пералічэнню. Сёння, напрыклад, пакупнікі з Грэцыі набылі цікавую карціну мастака Уладзіміра Тоўсціка. А заўтра чакаем прадстаўнікоў з буйнога санаторыя: яны жадаюць выбраць прыгожыя пейзажы для сваіх інтэр'ераў.

Зразумела, шкада, што там, дзе раней была каўбаса, сёння яе не стала. Але ж добра тое, што мы атрымалі магчымасць знаёміцца з творамі, якія ў тыя часы рэдка выстаўляліся і амаль не прадаваліся. Нездарма ж спрадвеку кажуць: не аб адзіным хлебе жывы чалавек.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

18 чэрвеня

Беларускае тэлебачанне

15.05. «Каханнем за каханне». Мастацкі фільм.
16.30. Навіны.
16.35. «Госця з будучыні». 4-я серыя.
17.40. «Па слядах брэменскіх музыкантаў». Мультфільм.
18.00. Дак. фільмы «Каб горан не згас», «Ачаг».
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце маё пісьмо...
19.15. Мерыдыян. На зямлі Міжрэчча.
20.05. «Рамансы». Фільм-канцэрт.
20.25. Тыдзень беларускага ўрада.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Студыя «Формула».
23.00. НІКа.
23.15. «Геракл». Клуб культурыстаў.

І канал. Астанкіна.

10.00. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Зборная Швецыі — зборная Англіі. У перапынку (11.00) — Навіны (з сурдаперакладам).
12.20. «Дом». Аб традыцыях старэйшага пакалення.
12.55. В.-А. Моцарт. Сімфонія № 15 соль мажор.
13.10. Тэлемікст.
14.20. «Так і будзе!» Мастацкі фільм. 2-я серыя.
15.30. «Пакуль гарыць свечка». Тэленарыс.
15.55. Фільм — дзецям. «Прыгоды Арслана». 1-я серыя.
17.20. ...Да 16 і старэйшым.
18.00. «Багатыя таксама плачуць».
18.40. Кінапанарама.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.35. Прэзентацыя VII тэлеконкурсу «Ялта-92».
21.00. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Зборная Шатландыі — зборная СНД.
23.30. «Лімпапо».
0.00. ТБ — версія.
0.30. «Так і будзе!» Мастацкі фільм. 1-я і 2-я серыі.

Канал «Расія»

10.10. Момант ісціны. Былы дырэктар Чарнобыльскай АЭС В. Брюханаў адказвае на пытанні А. Каравулава.
11.05. Дак. панарама. «На схілах старажытнага вулкана».
11.20. «Малыя гарады — вялікія праблемы».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Там-там навіны.
15.15. Расійская Энцыклапедыя. І. А. Ганчароў.
16.00. Прадпрымальніцтва і традыцыі.
16.15. Школа менеджэраў.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Расія і свет.
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. Панове-таварышы.
18.00. Пятае кола.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Камерцыйны веснік.
19.40. Пятае кола. Працяг.
20.15. Хрона. У свеце аўта- і мотаспорту.
20.45. Без рэтушы. Віцэ-прэзідэнт А. У. Руцкой у прэс-цэнтры.
22.00. Весткі.
22.20. Крымінальныя паведамленні.
22.30. На сесіі ВС Расіі.
23.00. І. Стравінскі. Балет «Апалон».
23.45. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Зборная Галандыі — зборная Германіі.

19 чэрвеня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Дарога ў пекла». 2-я серыя.
15.05. «Нашы суседзі». Мастацкі фільм.
16.30. Навіны.
16.35. «Госця з будучыні». 5-я серыя.
17.40. «Прыгоды Мурзілкі».
18.00 Дак. фільмы «Паэзія без слоў», «У палоне юнацтва свайго».
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Наш каментарый. «Плакала Саша, як лес высякалі...»
19.15. Рэха тэлемарафона «Выратуем дзяцей!» Прамая лінія.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. «Нашы суседзі». Мастацкі фільм.
22.45. «Агат — камень каштоўны». Супрацоўніцтва з Польшчай у правядзенні эканамічных рэформаў.
23.00. НІКа.
23.15. «На шляху да Барселоны». Сяргей Каленнік. Веславанне на байдарках і каноэ.

І канал. Астанкіна

5.00, 5.30, 8.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.00. Навіны.
5.20, 7.50. Ранішняя гімнастыка.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.00. Кінапанарама.
10.10. «Клуб падарожнікаў» (з сурдаперакладам).
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Зборная Галандыі — зборная Германіі.
13.15. Брыдж.
13.40. Бізнес-клас.
14.20. «Будзем чакаць, вяртайся...» Мастацкі фільм.
15.45. «Прыгоды малога Гіпапо». Мультфільм.
15.55. Фільм — дзецям. «Прыгоды Арслана». 2-я серыя.
17.25. Чалавек і закон.
17.55. «Сіротка Эні». Мультфільм.
18.05. Дзённік І Міжнароднага юнацкага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага.
18.25. ТБ «Нява». «Хто з намі?»
18.45. «Эміль з Ленебергі». 10-я серыя.
19.10. Яраслаўскі фестываль «Жанчына ў тэатры».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.40. «Поле цудаў», «Музагляд», «Адпачывай», «Хіт-канвеер». Выязное пасяджэнне «Палітбюро».
0.15. Відэадром.
0.45. «Будзем чакаць, вяртайся...» Мастацкі фільм.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Зборная Шатландыі — зборная СНД.
9.55 «Тэлебудсервіс».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Там-там навіны.
15.15. Першы тайм.
15.30. «Галоўны тут я».
16.15. Прастора плюс.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. «Дзеючая мадэль-3».
17.45. М-трэст.
18.00. Белая варона.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. «САС» і мастацкі фільм «Люстэрка».
22.00. Весткі.
22.20. «Швецыя-92».
22.35. «Кінограф», «3, 2, 1».
23.25. На сесіі ВС Расіі.

ДА ВЕДАМА ТЭЛЕГЛЕДАЧОЎ І РАДЫЁСЛУХАЧОЎ МІНСКА І МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

У сувязі з планавым капітальным рамонтам антэнна-фідэрных канструкцый тэхнічных сродкаў Мінскага цэха ультракароткахвалевых радыёперадатчыкаў перадачы па ўсіх тэлевізійных праграмах, а таксама па ультракароткахвалевых радыёстанцыях 18, 19 чэрвеня будуць пачынацца пасля 14 гадзін.

26 чэрвеня ў 15.00 у аўдыторыі 433 Белдзяржуніверсітэта адбудзецца сустрэча выпускнікоў 1972 года матэматычнага факультэта і факультэта прыкладной матэматыкі.

РАДЫЁ

19 чэрвеня

Апошнія паведамленні: 6.00, 7.00, 10.00, 15.00, 20.00, 23.00.

7.00 — «Радыёфакт». 8.15 — «Вясковыя ростані». 9.15 — нататкі У. Глушакова. Частка 2-я, заключная. 10.15 — З. Бядуля. «Сярэбраная табакерка». Інсцэніраваная аповесць. Частка 2-я, заключная. 11.20 — «Саветы, улада і справы». 12.00 — «Апоўдні». 13.00 — «У абедзенны перапынак». Інфармацыйна-музычная праграма. 14.00 — «Старонкі класічнай музыкі». 15.15 — музычная праграма. 16.05 — «Ад 8 да 14». Праграма для школьнікаў. 16.35 — «Любімыя мелодыі». Канцэрт. 17.00 — «Чытаючы В. Быкава». Музычная праграма. 18.00 — перадачы абласнога радыё. 19.00 — гуманітарна-інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». 19.45 — вячэрняя казка. 20.00 — «Дзень нашага жыцця». 20.40 — «Машэрава, 21. Прафсаюзны веснік». 21.00 — «Парад зорак». Эстрадная праграма. 23.10 — «Ад танга да фокстрота». Эстрадны канцэрт. 0.00 — «Начны канал».

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ
СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Аб тым, як прадухіліць спад вытворчасці і аб шляхах выхаду з эканамічнага крызісу разважае Валерый Дашкевіч у артыкуле **«Ці ўпішацца «неразумная маса» ў новую сістэму каардынат?»**

Пад рубрыкай **«Грымасы рынку»** — карэспандэнцыя Пятра Радзечкі **«Дапамагчы таму, хто хоча выплысці».**

Інфармацыя аб рассакрэчаных матэрыялах з асабістага архіва Сталіна.

Аб новым прымяненні лазера ў медыцыне паведамляе Дзмітрый Патыка: **«Малыш» дапаможа малышу».**

Пад рубрыкай **«Паміж намі, адпускнікамі»** публікуюцца нататкі **«Крым, ён і ёсць Крым».**

Аб сітуацыі на граніцы паміж Беларуссю і Літвой расказвае Канстанцін Балатэвіч у карэспандэнцыі **«Кантрабанда вагой у... 400 тон».**

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда». ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін — 32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 81.098. Індэкс 63.850.
Зак. № 121.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12